Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
Месцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок нанпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок нанпарэлі пасьпрэ тэксту 1 р. — к.
За радок нанпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. даражэй.
Зьыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 92 (2280) Пятніца, 20-га красавіка 1928 г.

Разам з масамі.

Выяўленыя за апошні час цяжкасьці ў хлебазагатоўчай кампаніі, выкрыцьцё шахцінскай змовы—зноў і зноў прымушаюць нас праверыць і лепш, чымся да гэтага часу, паставіць працу па ўцягваньні рабоча-сялянскіх мас у барацьбу з нашымі недахопамі. Другі (неаб'яднаны) пленум ЦКК, які праводзіўся за дзень да апошняга аб'яднанага пленуму, іменна на гэта зьвярнуў сваю галоўную ўвагу.

Посьпех барацьбы з недахопамі апарату ў першую чаргу залежыць ад таго, ці будзе правільна накіравана ўвага працоўных на канкрэтныя задачы, пастаўленыя партыяй і ўладаю,—на праверку выкананьня ўсімі зьвеньнямі апарату гэтых дырэктыў. Праверка гэта, як зазначана ў рэзалюцыях пленуму ЦКК, ні ў якім разе не павінна быць фармальнай,—наколькі процантаў ці да якога часу выкананы тыя ці іншыя дырэктывы,—праверка павінна быць па сутнасьці—наколькі дырэктывы вышэйшых органаў мэтазгодны, могуць быць ажыцьцёўлены, якую яны прынесьлі карысьць і інш. Нажаль, трэба канстатаваць, што праверкай выкананьня дырэктыў у нас да апошняга часу займаліся мала, а калі і займаліся, дык толькі апаратныя працаўнікі РСІ.

Уцягнуць тысячы пралетарыяў і сялян у гэту частку працы РСІ—найгалоўнейшая задача і партыі і органаў улады. Увага шырокіх мас павінна быць таксама накіравана на папярэджаньне і своячасовае зьнішчэньне недахопаў у працы гаспадарчых і іншых арганізацый. Іменна папярэджаньне, бо, нажаль, вельмі часта ў працы і грамадзкіх арганізацый (напрыклад, сэкцыі саветаў), і ў працы РСІ найбольш момантаў «канстатаваньня» мінулых памылак, недахопаў, якія цяжка ўжо паправіць. Між тым важна, каб пралетарская грамадзкасьць і ўсе нашыя органы папярэджвалі аб магчымасьці зьяўленьня непарадкаў, своячасова гаварылі аб небясьпецы і неабходнасьці ўжыць адпаведныя меры. Усё гэта магчыма толькі пры шырокай крытыцы нашых недахопаў.

За апошні час на старонках нашага друку шмат зьвернута ўвагі на недахопы дзяржапарату. Няправільна было-б, аднак, абмежавацца крытыкай у друку. У першую чаргу трэба разьвіць самакрытыку ў нашых масавых арганізацыях.

Пленум ЦКК зазначыў, што за апошнія гады ўзмацніўся і вырас шэраг арганізацый, якія могуць сапраўды па-ленінску ўдзельнічаць у перабудове нашага дзяржапарату. Сэкцыі саветаў (і, у прыватнасьці, сэкцыі РСІ), вытворчыя камісіі, эканомкамісіі, кантрольныя камісіі на асобных заводах, рабочы актыў, замацоўваемы за савецкімі установамі, дэлегацкія сходы работніц,—усё гэта магутная рабочая грамадзкасьць, гатовая дапамагчы будаўніцтву сацыялістычнай гаспадаркі.

У межах гэтай грамадзкасьці крытыка нашых недахопаў для іх папярэджаньня і зьнішчэньня павінна зьяўляцца асновай працы РСІ. Улічваючы гэта, пленум ЦКК ухваліў пастанову, па якой мясновым органам КК—РСІ запрапанавана прыцягваць да адказнасьці кожнага, хто спрабуе абмежаваць крытыку нашых недахопаў, хто захоча прасьледаваць крытыкуючых рабочых і сялян. Апроч крытыкі ў друку, апроч абмеркаваньня нашых недахопаў у грамадзкіх арганізацыях, пленум ЦКК запрапанаваў усім савецкім, гаспадарчым і іншым органам правесьці ў жыцьцё дадзеныя яшчэ ў 1918 г. указаньні т. Леніна аб прыёме адказнымі кіраўнікамі ўсіх грамадзян без усялякіх прапускоў у вызначаныя дні і гадзіны, аб абавязковых адказах на пададзеныя заявы і інш. Гэта павінна наблізіць наш дзяржапарат да абслугоўваемага ім насельніцтва.

Адным з найважнейшых мэтадаў аздараўленьня дзяржапарату зьяўляецца рашучае ўкамплектаваньне яго рабочымі. Пленум ЦКК запрапанаваў РСІ заняцца распрацоўкай пытаньня аб бязупынным вылучэньні ўсё новых рабочых і аб правільным выкарыстаньні ўжо вылучаных.

Асабліва пленум падкрэсьліў неабходнасьць зьвярнуць увагу на праверку выкарыстаньня і вылучэньня пралетарскай інтэлігенцыі, якая скончыла нашы ВУЗ'ы.

Толькі правільна, па-ленінску выкрыўшы нашы памылкі і хібы, толькі праз масы і разам з імі, прымаючы ўдзел у зьнішчэньні гэтых памылак, мы даможамся яснасьці ў працы савецкага, гаспадарчага апарату. Гэта зьяўляецца асноўным у пастановах апошняга пленуму ЦКК.

Трагедыя „міру ў прамысловасьці"

АНГЕЛЬСКІЯ РЭФАРМІСТЫ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА СЬЛЯПОЮ ЗБРОЯЮ Ў РУКАХ КАПІТАЛУ.

ЛЁНДАН, 18-4. Спэцыяльная камісія, заснаваная пасьля студнёўскае канфэрэнцыі па пытаньні аб «міры ў прамысловасьці» (у склад яе ўваходзяць прадстаўнікі працы прыёмцаў і генэральнае рады прафсаюзаў) падала міністру фінансаў Чэрчылю мэмарандум з хадайніцтвам, каб урад назначыў «падрабязнае абсьледаваньне пытаньняў нацыянальнага крэдыту, між іншым, пытаньня аб залатым запасе і яго значэньні для прамысловасьці».

Мэмарандум зусім не абмяркоўваўся ў генэральнай радзе, прадстаўнікі якое падпісалі мэмарандум, не запытаўшы генэральную раду.

Мэмарандум заяўляе, што становішча ангельскае прамысловасьці можа быць палепшана толькі ў тым выпадку, калі «гібкасьць грашовае сыстэмы і крэдыту будзе досыць забясьпечана дзеля задаволеньня патрэб прамысловасьці і гандлю».

У дзелавых і палітычных колах тлумачаць гэта, як жаданьне прамысловцаў спыніць палітыку залатога парытэту фунту стэрлінгаў і перайсьці да палітыкі інфляцыі. У некаторых колах выказваюць думку, што прадстаўнікі генэральнае рады ў спэцыяльнай камісіі, падпісаўшыя мэмарандум, не асьвядомлены аб сапраўдных імкненьнях прамысловцаў і сталі сьляпою зброяю ў іх руках.

РАСКОЛ СЯРОД БАСТУЮЧЫХ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ БАМБЕЮ.

ЛЁНДАН, 18-4. Агенцтва Рэйтэр паведамляе: „Рознагалосьсі між рабочымі лідэрамі перашкодзілі распаўсюджаньню забастовачнага руху, які пачаўся на бамбейскіх тэкстыльных прадпрыёмствах. Каля паловы бастуючых у колькасьці 15.000 чал. распачалі працу. Праца аднавілася на 9 прадпрыёмствах. Рэшта бастуючых, водлуг чутак, цьвёрда пастанавіла ня спыняць забастоўкі, для правядзеньня якое назначан забастовачны камітэт у скадзе 85 чалавек.

ПА ШЛЯХУ ГАЛОДНАЕ СЬМЕРЦІ.

ЛЁНДАН, 18-4. Працэсія чыгуначнікаў Лілуа (Усходняя Індыя) уздоўж чыгуначнае калёіны, распачатая дзеля закліку да забастоўкі чыгуначнікаў іншых пунктаў, спынена з тае прычыны, што ісьці далей не пад сілу бастуючым рабочым, змораным доўгаю галадоўкаю і іншымі турботамі.

Пад сьцягам клясавага змаганьня

АГУЛЬНАНЯМЕЦКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ КАМСАМОЛУ Ў ХЕМНІЦЫ.

БЭРЛІН, 14-4. У зьвязку з агульна-нямецкім днём моладзі арганізаваным нямецкім камсамолам, у Хемніцы адбылася агульна-нямецкая канфэрэнцыя камсамолу. Канфэрэнцыя заслухала даклад аб апошніх пленумах выканкому Камінтэрну і Камінтэрну Моладзі. Пасьля дзелавых спрэчак, у якіх пераважна закраналася пытаньне аб працы прафсаюзаў, канфэрэнцыя аднагодна ўхваліла пастанову далучыцца да ўсіх рэзалюцый пленуму выканкому Камінтэрну і выканкому Камінтэрну Моладзі.

Канфэрэнцыя далей абмеркавала бліжэйшыя задачы нямецкага камсамолу, асабліва ў зьвязку з надыходзячымі перавыбарамі рэйхстагу і ўзмацненьнем наступу капіталу. У спрэчках абмяркоўваліся канкрэтныя прапановы аб практычнай працы ў часе перавыбарчае кампаніі на прадпрыёмствах, у прафсаюзах і іншых масавых арганізацыях. Спрэчкі выявілі поўную аднадушнасьць усяго нямецкага камсамолу і паказалі, што ў ім ліквідаваны нават рэшты ранейшых апазіцыйных плыняў.

Рэзалюцыя аб бліжэйшых задачах нямецкага камсамолу была ўхвалена на канфэрэнцыі аднагодна.

Адначасна канфэрэнцыя зьвярнулася з закліканм да маладых рабочых Нямеччыны ў зьвязку з надыходзячымі перавыбарамі рэйхстагу і пацьвердзіла салідарнасьць нямецкае рабочае моладзі з бастуючымі мэталёўцамі ў Хемніцы.

У адзнаку агульнанямецкае канфэрэнцыі і дню моладзі ў Хемніцы была арганізавана масавая дэманстрацыя, у якой удзельнічала блізка 45-ці тысяч рабочых. Дэманстрацыя скончылася мітынгам, на якім быў ухвалены тэкст адказу нямецкіх камуністычных юнацкіх арганізацый на прывітальны ліст ленінградзкае арганізацыі УсеЛКСМ. Далей мітынг паслаў прывітаньне 55-му палку Чырвонае арміі, шэфам якога зьяўляецца нямецкі камсамол.

ПЕРАЛЁТ З ЭЎРОПЫ ПРАЗ АНТЛЯНТЫЧНЫ АКІЯН

НЬЮ-ЁРК, 14-4. Апарат Юнкерса, на якім нямецкія лётчыкі зрабілі пералёт з Ірляндыі праз Атлянтычны акіян, зьнізіўся на высьпе Грынлі каля берагоў Канады. Учасе пасадкі апарат трохі папсаваўся, але люзэі не папярпелі. Удзельнікі пералёту—капітан Кель, лётчык Гуннэфельд, фінансіст Бэкер і ірляндзкі міністр авіяцыі Фіц-Морыс—палядуць у Нью-Ёрк на другім апараце.

У Нямеччыне ідзе разгром рэвалюцыйнага руху.

АГУЛЬНАНЯМЕЦКІ САЮЗ ЧЫРВОНЫХ ФРАНТАВІКОЎ РАСПУШЧАН УРАДАМ.

ШМАТ ЯКІЯ ПРАВІНЦЫЯЛЬНЫЯ ЎРАДЫ ПРАТЭСТУЮЦЬ ПРОЦІ ЗАГАДУ МІНІСТЭРСТВА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ.—КАБ АПРАУДАЦЦА ПЕРАД ВЫБАРШЧЫКАМІ МАРКС ІМКНЕЦЦА АБМАЛЯВАЦЬ РОСПУСК, ЯК АСАБІСТЫ АКТ МІНІСТРА-НАЦЫЯНАЛІСТА КЕЙДЭЛЯ.

Першыя водгукі.

БЭРЛІН, 18-4. Водлуг вестак „Бэрлінэр Тагеблят", апрача Прусіі і Гэсэна пратэст проці патрабаваньня агульна-нямецкага міністра ўнутраных спраў Кейдэля аб роспуску чырвонага саюзу франтавікоў выказалі таксама Браўншвэйг, Мэкленбург, Гамбург і Любэк.

Далей газэта паведамляе: водлуг растлумачэньня «адпаведнае агульнанямецкае ўстановы», хоць Кейдэль паведаміў канцлера і іншых міністраў аб сваім намеры распусьціць чырвоны саюз франтавікоў, але ён не атрымаў непасрэднае згоды ад канцлера на гэтую меру і праводзіў яе ў межах ведамсьцьвеннае кампэтэнцыі міністэрства ўнутраных спраў. У палітычных колах лічаць, што гэтае растлумачэньне імкнецца, як відаць, зьняць з канцлера Маркса адказнасьць за роспуск чырвонага саюзу франтавікоў, бо проці роспуску пярэчаць урады асобных нямецкіх дзяржаў, у склад якіх уваходзяць прадстаўнікі партыі цэнтру. „Фосішэ Цэйтунг" адзначае поўную неабгрунтанавасьць патрабаваньня, каб распусьціць чырвоны саюз франтавікоў, г. зн. неабгрунтаванасьць спасылкі на гвалтоўніцкае вызваленьне літаратара Ото Брауна з будынку акруговага суду ў Моабіце (якое было ўчынена невядомымі асобамі) і на стычкі між членамі чырвонага саюзу франтавікоў і членамі рэакцыйных баявых арганізацый.

ПАГРОЗА НАСКОКУ НА САВЕЦКІЯ ЎСТАНОВЫ.

У БЭРЛІНЕ ЧАКАЮЦЬ ХВАЛІ ВОБЫСКАЎ І АРЫШТАЎ.

БЭРЛІН, 18-IV. Водлуг вестак «Вэльт Ам Абэнд», у зьвязку з забаронаю чырвонага саюзу франтавікоў, у Бэрліне падрыхтоўваюцца шматлікія вобыскі ў рабочых арганізацыях і савецкіх установах. Як кажа газэта, прычыну выступленьня Кейдэля належыць шукаць ня толькі ў націску, які зрабілі на яго партыйныя аднадумцы, але і ў таемных гутарках з ангельскімі палітычнымі дзеячамі.

«Забарона чырвонага саюзу франтавікоў—піша газэта—будзе, як відаць, пачаткам кампаніі, якая будзе праведзена па прыкладзе вядомых лёнданскіх падзей пры дапамозе фомак і тлёнавых плавільных апаратаў».

УРАЧЫСТАСЬЦЬ ДЛЯ МЕНШАВІКОЎ.

БЭРЛІН, 18-4. У зьвязку з прапанаваю нямецкага міністра ўнутраных спраў распусьціць чырвоны саюз франтавікоў прускі ўрад падаў тэлеграфна апэляцыю ў вярхоўны суд, гесенскі ўрад—таксама.

У камуністычных колах зазначаюць, што выступленьне прускага ўраду (сацыял-дэмакратычнага) проста павінна прыкрыць сапраўдныя намеры сацыял-дэмакратыі, якая дасканала ведае, што вярхоўны суд сьпешна ўхваліць пастанову аб роспуску чырвонага саюзу франтавікоў, чаго даўно чакаюць сацыял-дэмакраты.

Паведамляюць, што НЯМЕЦКІ ЎРАД ПРАПАНАВАЎ ВЯРХОЎНАМУ СУДУ НЕАДКЛАДНА ЎХВАЛІЦЬ ПАСТАНОВУ.

Выпады рэакцыйнага друку.

БЭРЛІН, 18-IV. Правы друк узьняў проці чырвонага саюзу франтавікоў вострую кампанію. Так, орган вайсковых колаў нацыяналістаў «Крэйцэйтунг» піша: «Чырвоны саюз франтавікоў—адзін з фактараў, якія складаюць магутнасьць бальшавізму ў Нямеччыне. Гэта—будучая Чырвоная армія Масквы ў краі, ад рэвалюцыянізаваньня якога камуністы не адмовіліся. Жыцьцёвыя інтарэсы дзяржавы пастаўлены на карту, і гэтыя інтарэсы больш лёгка забясьпечыць загадзя, чымся ў момант вострага крызісу».

АНТЫСАВЕЦКАЯ МІСІЯ БІРКЕНХЭДА Ў БЭРЛІНЕ.

ЛЁНДАН, 18-4. „Дэйлі Геральд", абгаворваючы прамову ангельскага міністра па справах Індыі лёрда Біркенхэда, які ў сучасны момант знаходзіцца ў Бэрліне, гаворыць, што падарожжа Біркенхэда ў Нямеччыну можа прывесьці да вельмі сур'ёзных дыпляматычных і міжнародных вынікаў. Далей газэта зазначае, што палата вобшчын «мае права ведаць, што робіць Біркенхэд у Бэрліне, а таксама, ці пагоджаны ўчынкі Біркенхэда з урадам, ці хоць-бы з міністрам замежных спраў, і ці не распачынае ангельскі ўрад новы дыпляматычны ход проці СССР».

ПРАТЭСТ КАМІТЭТУ АБАРОНЫ ГРАМАДЫ.

Камітэт навуковых работнікаў і пісьменьнікаў БССР па абароне Грамады, даведаўшыся аб АДМАЎЛЕНЬНІ ПОЛЬСКІМ УРАДАМ У ВЫДАЧЫ ВІЗЫ КАРЭСПАНДЭНТУ ЎРАДАВАЙ ГАЗЭТЫ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», выражае свой энэргічны пратэст супроць гэтага акту польскае ўлады.

Камітэт з абурэньнем адзначае гэты акт польскае ўлады, зазначаючы, што фактам нявыдачы візы карэспандэнту газэты «Савецкая Беларусь» польскі ўрад лішні раз даводзіць сваё ІМКНЕНЬНЕ СХАВАЦЬ АД ШЫРОКАЙ ГРАМАДЗКАЙ ДУМКІ НЯ ТОЛЬКІ ПОЛЬШЧЫ, АЛЕ І ЎСІХ КРАІН КЛЯСАВУЮ СУДОВУЮ РАСПР. ВУ Ў СЬЦЕНАХ ВІЛЕНСКАГА ПОЛЬСКАГА СУДУ НАД ПРАДСТАЎНІКАМІ БЕЛАРУСКАГА НАСЯЛЕНЬНЯ Ў ПОЛЬШЧЫ, БЕЛАРУСКАЙ СЯЛЯНСКА-РАБОТНІЦКАЙ ГРАМАДЫ.

ПРЭЗЫДЫУМ КАМІТЭТУ НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ І ПІСЬМЕНЬНІКАЎ БССР ПА АБАРОНЕ ГРАМАДЫ.

3-я Сэсія ЦВК СССР.

АГУЛЬНЫЯ АСНОВЫ ЗЕМЛЯКАРЫСТАНЬНЯ І ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЯ НА РАЗГЛЯДЗЕ СЭСІІ.

МАСКВА, 19-4. Згодна пастановы Чацьвертага Зьезду Саветаў СССР, было намечана некалькі мерапрыёмстваў у галіне разьвіцьця і палепшаньня земляўпарадкаваньня і землякарыстаньня, а таксама ў галіне ўпарадкаваньня законадаўства па гэтых пытаньнях. Між іншым, зьезд ухваліў мерапрыёмствы саюзнага ўраду па падрыхтоўцы выданьня „Агульных асноў земляўпарадкаваньня і землякарыстаньня".

„Агульныя асновы землякарыстаньня і земляўпарадкаваньня" ў сучасны момант распрацаваны саюзным урадам і пададзены на разгляд працуючае зараз сэсіі ЦВК Саюзу ССР. Зьмест гэтага новага закону, які мае вялічэзнае значэньне як для саюзных рэспублік, так і для Саюзу ў цэлым, у наступным:

Асноваю зямельнае пабудовы—зазначана ў гэтым законе, які забясьпечвае магчымасьць сацыялістычнага будаўніцтва ў сельскай гаспадарцы, правядзеньне земляўпарадкаваньня і арганізацыю землякарыстаньня ў інтарэсах асноўнай масы сялянства, беднякоў і сераднякоў,—зьяўляецца нацыяналізацыя зямлі, г. зн. адмена раз на заўсёды прыватнае ўласнасьці на зямлю і ўстанаўленьне выключна дзяржаўнае ўласнасьці на яе. Розныя зьдзелкі, якія парушаюць асновы нацыяналізацыі зямлі (купля, продаж, заклад, перадача і г. д.) на маюць моцы і выклікаюць пазбаўленьне ўдзельнікаў гэтых зьдзелак права карыстацца зямлёю з прыцягненьнем іх і іх супольнікаў да крымінальн й адказнасьці. Пры правядзеньні земляўпарадкаваньня і арганізацыі землякарыстаньня галоўнаю задачаю зьяўляецца разьвіцьцё вытворчых сіл сельскае гаспадаркі і ўсё большае ўзмацненьне ў ёй сацыялістычных элемэнтаў. Сродкам для гэтага служыць павышэньне тэхнічнага ўзроўню сельскае гаспадаркі, каапераваньне шырокіх гушчаў працоўнага сялянства, узмацненьне і разьвіцьцё сеткі калектыўных і савецкіх гаспадарак, а таксама сапраўдныя захады да абароны інтарэсаў незаможных гушчаў вёскі і сельска-гаспадарчых рабочых і да перамогі над кулацтвам.

Далей закон дакладна ўстанаўляе кампэтэнцыю Саюзу ССР і саюзных рэспублік у галіне зямельнага законадаўства, а таксама рэгламантуе правы працоўных на зямлю. Пераважнае права на атрыманьне зямлі ў працоўнае карыстаньне маюць сельска-гаспадарчыя калектывы, а таксама бяднейшае малазямельнае жыхарства. Законам забараняецца даваць ранейшым памешчыкам і іншым земляўласьнікам, выселеным з належаўшых ім гаспадарак, зямлю ў тых губэрнях і округах, дзе яны раней ёю ўладалі.

САВЕЦКАЕ ЗОЛАТА ПЕРАГРУЖАНА З „ДРЭЗДЭНУ"?

ПАРЫЖ. Агенцтва Гаваса паведамляе з Лёндану заяву прадстаўніка «Норд Дэйчэр Лёйд», нібы ўночы каля Фальмута, за зонаю брытанскіх тэрытарыяльных вод, савецкае золата, якое везьлі з Амэрыкі на парахоўзе «Дрэздэн», было перагружана на невядомы савецкі пароход, які тут-жа накіраваўся ў невядомым напрамку. Далей у заяве гаворыцца, нібы савецкі пароход прыбыў у чацьвер у Грэсэнд і вышаў у мора ў пятніцу, паведаміўшы па радыё «Дрэздэн», што будзе чакаць яго ў Ляманшы.

Адначасна агенцтва Гавас заяўляе, што вайсковыя колы ня вераць чуткам аб перагрузцы золата, бо нямецкія афіцэры дакладна прытрымліваюцца марскога кодэксу; перагрузка-ж грузу ў адкрытым моры, а ня ў порце назначэньня, можа рабіцца толькі ў выпадку аварыі.

АДСТУПЛЕНЬНЕ МУКДЭНЦАЎ.

НАНКІНСКАЯ КАВАЛЕРЫЯ Ў ТЫЛЕ ПАЎНОЧЦАЎ.

ШАНХАЙ, 17-4. Водлуг паведамленьняў афіцыйнага агэнцтва, арміі нанкінскага ўраду і Фын-Юй-сяна прас нуліся на ўсіх франтох. Паўднёўцы занялі Іенчжоу ў правінцыі Шандунь. Важны стратэгічны пункт Цьзінін (у 20 клм. на поўдзень ад Іенчжоу) абружаны. Кавалерыя паўднёўцаў перайшла рэчку Жоўтую ў заходняй частцы Шандуні і знаходзіцца ў тыле паўночцаў.

Перадаюць, што ў зьвязку з наўдачамі, пакарана сьмерцю 3 шандуньскія генэралы.

Шанхайскія рабочыя рыхтуюцца да рэвалюцыі.

ШАНХАЙ, 17-IV. Паведамляюць, што дэлегаты шанхайскіх рабочых-японцаў заснавалі сувязь з рэвалюцыйнымі арганізацыямі кітайскіх рабочых і праводзяць супольную працу па ўзмацненьні рэвалюцыйнага руху.

Японія паслала войска ў Шанхай.

ТОКІЁ, 17-IV. З прычыны пашырэньня тэатру ваенных апэрацый у Кітаі, урад пастанавіў паслаць з Цындао войска ў Цьзінань «для абароны японцаў» і дазволіў вайсковаму міністэрству ў выпадку выключнае небясьпекі паслаць войска ў Шандуньскую правінцыю непасрэдна з Японіі.

ПАГАЛОСКІ АБ МАГЧЫМЫМ ПЕРАВАРОЦЕ Ў ЛІТВЕ.

Польскія газэты падаюць весткі аб магчымым перавароце ў Літве. Пераварот гэты быццам адбудзецца пад правадырствам ксяндзоў, якія зьбіраюцца склікаць кангрэс, і ён пастановіць, калі пераварот павінен адбыцца.

ЗАЧЫНЕНА «ЛЕТУВОС ЖЫНІЁС».

КОЎНЯ, 16-IV. Орган народнікаў «Летувос Жыніёс», згодна загаду вайсковага камэнданта Коўні, зачынен на месяц. У афіцыйным паведамленьні зазначаецца, што прычынаю зачыненьня зьяўляюцца сфабрыкаваныя газэтаю весткі аб чутках у Парыжы, нібы замах на жыцьцё італьянскага караля ў Мілане быў наладжаны самімі фашыстамі».

Выступленьне Пангалоса ў прэсе.

ВЕНА, 18-IV. Водлуг паведамленьняў з Атэн, у грэцкім друку агалошаны ліст Пангалоса, у якім ён заяўляе, што ўсе чуткі аб падрыхтоўцы змовы на яго карысьць зьяўляюцца толькі манэўрам з мэтаю паўторна выслаць яго з Атэн.

РАСПРАВА ФРАНЦУСКАЙ БУРЖУАЗЕІ З КАМПАРТЫЯЙ.

ПАРЫЖ, 18-IV. Адказныя рэдактары нарыядычных выданьняў французкае кампартыі, якія абвінавачваліся ў зьнявазе асоб вайсковага камандніцтва складу, засуджаны завочна: Гей—да 10 месяцаў астрогу і 1.000 франкаў штрафу, Мішле—да 2-х месяцаў астрогу і 200 франкаў штрафу, Фуркад—да 8 мес. астрогу і 800 франкаў штрафу.

Апэляцыйны суд зацьвердзіў ранейшыя 15 прысудаў у адносінах да Гея. У выніку Гей засуджаны да 15 гадоў астрогу і 100 тыс. франкаў штрафу.

ГАЛАДОЎКА ПАЛІТЫЧНЫХ ВЯЗЬНЯЎ.

БЭРЛІН, 18-IV. 32 пралетарскіх палітычных зьняволеных зонэнбурскага астрогу абвясьцілі галадоўку ў знак пратэсту проці суровага рэжыму, які ўжываецца ў адносінах да іх у той час, як фашысты, засуджаныя за тайныя палітычныя забойствы, карыстаюцца рознымі прывілеямі. Абвясьціўшыя галадоўку палітычныя патрабуюць дазволіць ім зносіны па нядзелях і даваць сьвет у каморы да 12 гадзін ночы.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Канфлікт у польскай вугляпрамысловасьці.

ВАРШАВА, 18-4. У вугольнай прамысловасьці распачынаецца канфлікт. Прадпрыёмцы пастанавілі скасаваць калектыўныя ўгаворы з рабочымі, і чынячы з 1-га мая. Клясавы прафсаюз гарнякоў пастанавіў не згаджацца з пастановаю прадпрыёмцаў і з свайго боку патрабаваць надбаўкі на дарагоўлю.

Арышты сяброў ППС лявіцы.

У Заверцу апошнімі днямі арыштавана шмат дзеячоў пэпэсэсаўскай лявіцы. Арыштаваныя абвінавачваюцца ў антыдзяржаўнай дзейнасьці і супрацоўніцтве з кампартыяй.

КАМУНІСТЫЧНЫ СЬЦЯГ НА КРЫЖЫ.

На прыдарожным крыжу каля вёскі Пашха-Буда, Бялавэйскай гм., невядомыя асобы вывесілі камуністычны сьцяг з рознымі, як кажа «Газ. Варшавска», антыдзяржаўнымі надпісамі.

НОВЫ ПРЭЗЫДЫУМ «БЕЛ. ІНСТЫТУТУ ГАСПАДАРКІ І КУЛЬТУРЫ».

Адбыліся перавыбары прэзыдыуму «Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры». Старшынёю выбран А. Більдзюкевіч, віцэ-старшынямі: кс. А. Станкевіч і адвакат Бабянскі, скарбнікам—І. Васілеўскі, сэкратаром пасол Юхневіч і сябрамі пасол Каруза і Э. Будзька.

БАНКРОТ З УСІХ БАКОЎ.

«Газэта Варшавска» (№ 119) паведамляе, што б. старшыня б. ураду Зах. Украіны Галубовіч уцёк гэтымі днямі з Львова невядома куды. Прычынай уцёку зьяўляецца, як кажа «Газ. Варш.», заблытанасьць грашовых спраў Галубовіча і выкліканыя гэтым судовыя справы.

ЗВАЛЬНЕНЬНЕ З АСТРОГУ СТУД. ШУТОВІЧА.

Вядомы ходацкі беларускі дзеяч студэнт Я. Шутовіч пасьля паўтарамесячнай адсідкі ў вастрозе—гэтымі днямі выпушчан з Лукішак. Судовая ўлада абвінавачвае яго па 129 арт., ч. 1 і па 51 арт. К. К.

«ДЛЯ АХВЯР ЛІТОЎСКАГА ФАШЫЗМУ».

Група літоўскіх эмігрантаў сацыял-дэмакратаў заклала ў Вільні камітэт, які паставіў сваёю мэтай збор сродкаў на карысьць палітычных вязьняў Ковеншчыны.

ЗАСЕВЫ ПАД ПАГРОЗАЮ.

ВАРШАВА, 18-IV. З усіх округ Польшы надыходзяць трывожныя паведамленьні аб катастрафічным становішчы засеваў, з прычыны вельмі няспрыяючых атмасфэрных умоў.

КЯМЕЦКІ САЦЫЯЛІСТ АБ ПЕРАГЛЯДЗЕ ГРАНІЦ ПОЛЬШЧЫ.

Адзін з правадыроў нямецкіх сацыял дэмакратаў дэпутат Брэйтшэйд прачытаў даклад, у якім выказаўся за мірнае паразуменьне Нямеччыны з Францыяй, што можа даць магчымасьць перагляду і папраўкі ўсходніх границ Нямеччыны, якіх ня можа прызнаць нямецкі народ.

КРЫЗІС ПОЛЬСКА-НЯМЕЦКАГА ГАНДЛЮ.

ВАРШАВА, 18-4. Перамовы між старшынёю польскае дэлегацыі на гандлёвых перамовах з Нямеччынаю Твардоўскім і старшынёю нямецкае дэлегацыі Гермэсам аб аднаўленьні перамоў не далі канчатковых вынікаў.

АЎГАНСКІ КАРОЛЬ ЕДЗЕ Ў ПОЛЬШЧУ.

Кароль Аўганістану Аманулла з вялікай прыдворнай сьвітай 28 красавіка прыяжджае з Нямеччыны ў Варшаву, дзе забавіцца два дні, а потым выедзе з Польшчы праз пагранічную з Латвіяй станцыю Турлюнт.

ЗА ДЗЕНЬ.

Нацкоўваньне зноў аднавілася.

Французкі ўрад, нарэшце, пажадаў парушыць сваё доўгае маўчаньне ў справе з савецкім золатам. Праўда, і гэтае ўрадавае выступленьне мае досыць дзіўны характар. Нота, адасланая пасольству СССР 10 красавіка, не агалошана. Надрукавана толькі афіцыйнае комуніке, якое складзена ў намерана туманных выразах. Міністэрства замежных спраў Францыі ня выкладае зьместу сваёй ноты. Яно толькі апавядае, чаго ў ноце няма. А ў ёй няма, аказваецца, спасылак на перамовы аб даўгох. Перамовы-ж гэтыя, па высокаўтарытэтнаму сьцьвярджэньню Брыяна, працягваюцца шляхам перапіскі.

Французкія буржуазныя газэты ня так стрыманы, як французкі ўрад. Зразумела, нельга верыць усяму, што піша «Матэн» ці „Пці-Парызьен". Аднак, усё, напісанае імі, ні ў якой меры не супярэчыць агульнай лініі, узятай за апошні час французкім урадам у адносіне да СССР. «Пці-Парызьен» выкладае досыць падрабязна французкую ноту. З гэтай ноты відаць, што французкі банк зрабіў уплыў праз урад на французкага пасла ў Амэрыцы. Апошні, у сваю чаргу, падтрымаў патрабаваньне французкага банку перад дзяржаўным дэпартаментам Злучаных Штатаў, эразумела, «толькі ў парадку абароны інтарэсаў усіх французаў наогул».

Іншыя газэты выкарыстоўваюць ноту толькі для размоў аб тым, чаго ў ёй няма, г. зн. аб даўгох.

Калі чытаеш вытрымкі з гэтых газэт, можа здавацца, што варочаешся да часоў франка-савецкага канфлікту з-за Ракоўскага. Нацкоўваньне на СССР аднавілася з новаю сілаю.

З гутарак аб «прапагандзе» робіцца зусім выразны вывад, які можна выказаць каротка: **крэдытная блёкада СССР.**

Адначасна паведамляецца, што французкая дэлегацыя, якая вяла перамовы з СССР, распушчана па ініцыятыве самога Брыяна. Усё гэта сьведчыць аб тым, што Францыя робіць яшчэ крок па шляху антысавецкіх інтрыг.

Дзьве душы Паркера Гільбэрта і перагляд пляну Дауэса.

Калі праўдзівы весткі «Дэйтшэ Цайтунг» аб праэкце перагляду пляну Дауэса, які быў прадстаўлен Паркерам Гільбэртам і нібы адобран урадам Злучаных Штатаў, дык такім чынам гара нарадзіла мыш.

Новы плян не зьмяншае рэпарацыйнай цяжкасьці, ён толькі пераразьмяркоўвае суму пляцяжоў паміж рознымі іх крыніцамі. Зьмяншаецца частка дзяржаўнага бюджэту Нямеччыны, але расьце частка прыбытку ад аблігацый, выпушчаных нямецкай прамысловасьцю.

Сёлета з дзяржаўнага бюджэту ў лік рэпарацый плацілася 500 млн. марак. У 1928-29 г. г. сума гэта павінна вельмі павялічыцца — да 1.250 млн. марак. Магчыма, што генэральны агент па рэпарацыях мае пэсымістычны погляд на магчымасьць атрымаць гэткую суму з напружанага нямецкага бюджэту. Магчыма, што ён лічыць прамысловыя прыбыткі больш моцнай крыніцай.

Дык няхай менш дасьць бюджэт, але затое прамысловасьць выпусьціць новыя аблігацыі ў дадатак да ўжо выпушчаных і дадатковыя процанты па іх пакрыюць амаль цалкам усё, што будзе недабрана па бюджэту (210 млн.). У забесьпячэньне рэшты, 40 міліёнаў, будзе ўтворана некалькі новых прамысловых манаполій.

Усё гэта, бясспрэчна, крок па шляху да камэрцыялізацыі рэпарацыйнага доўгу, г. зн. да ператварэньня яго з дзяржаўнага ў прыватны. І, бадай, у гэтым шукаць ключ да растлумачэньня таго, чаму Паркер Гільбэрт уважае за лепшае прам

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

Электраэнэргія ў прамысловасьці.

МАСКВА, 17-IУ. У дакладзе саюзу зьездаў дзяржаўнае прамысловасьці і гандлю зазначалася, што прамысловасьць СССР электрыфікавана на 44 проц. і ў бліжэйшыя 5 гадоў будзе электрыфікавана поўнасьцю. У сучасны момант 12.840 прамысловых прадпрыёмстваў маюць заводзкія электрастанцыі з агульнаю моцнасьцю тры з паловаю мільёны конскіх сіл.

Да канца пяцігодзьдзя моцнасьць прамысловых электра-ўстановак перавысіць міліярд кілёват.

Заклік т. Бухарына да барацьбы з п'янствам.

МАСКВА, 18-IУ. 18-га красавіка ў Маскве ў клюбе Кухмістэрава Бухарын зрабіў даклад аб барацьбе з алкагалізмам. Ён зазначыў на неабходнасьць распачаць энэргічную барацьбу з п'янствам ва ўсім Саюзе, асабліва сярод моладзі.

Чыгуначныя канфэрэнцыі.

СЕВАСТОПАЛЬ, 18-IУ 20-га красавіка у Севастопалі адчыніцца чарговая савецка-літоўска-нямецкая чыгуначная канфэрэнцыя. 21-га красавіка ў Севастопалі назначана чарговая савецка-латвійска-эстонская чыгуначная канфэрэнцыя. Старшынёю савецкае дэлегацыі назначан упаўнаважаны НК Шляхоў у УССР т. Шыманоўскі.

Тав. Мяльнічанскі старшыня ЦК тэкстыльшчыкаў.

МАСКВА. На пленуме новага ЦК саюзу тэкстыльшчыкаў у склад прэзыдыуму абрана 9 чал. Старшынёю ЦК саюзу абраны Мяльнічанскі.

Перад выбарамі.

(Ад нашага ўласнага карэспандэнта).

20 мая ў Нямеччыне адбудуцца выбары ў рэйхстаг.

За час свайго дзесяцігадовага існаваньня нямецкая рэспубліка праводзіць выбары чацьверты раз. Першай спробай „вольных, яўных, тайных і простых выбараў" быў Вэймарскі Нацыянальны Збор. Гэта было ў 1919 годзе. Дарога да Вэймару была паліта крывёю шматтысячных рэвалюцыйных рабочых.

Наступныя парляманцкія выбары адбыліся ў 1920 годзе. Хоць саюз сацыялістых Носке з гвардыяй Гінденбурга і перамог рэвалюцыю, усё-ж рабочыя ня страцілі яшчэ веру ў заветы Кароля Лібкнэхта і Розы Люксэмбург і пры выбарах ў рэйхстаг сацыялісты атрымалі пераважную большасьць.

Выбары 1923 году ўжо адбыліся пад знакам зруйнаваньня рабочага фронту і ўзмацненьня рэакцыі. Яны далі рэйхстаг Дауэса, які закабаліў нямецкага рабочага, рэйхстаг Лёкарна, і, урэшце, рэйхстаг капіталістычнай дыктатуры і няпрыкрытай рэакцыі.

Цяпер гэты рэйхстаг распушчан. Праз некалькі тыдняў 40 міліёнаў выбаршчыкаў зробяць чарговы паварот кола гістарычнага лёсу маладой рэспублікі.

У які менавіта бок будзе гэты паварот, ніхто ня ведае. На абсалютны посьпех не разлічвае ніводная партыя. Пакуль што можна бачыць толькі тое, што барацьба будзе суровая, бязьлітасная. Ніводныя выбары не пачыналіся з такіх рашучых адшукваньняў партыямі грошай на выбарчую кампанію, як гэтыя. Буржуазныя партыі вымагаюць з кандыдатаў, а партыі сацыялістаў і камуністаў з выбаршчыкаў: хочаш посьпеху партыі—давай грошы. Барацьба надыходзіць суровая.

Справа тут ідзе ні больш, ні менш, як аб жыцьці і сьмерці. Ці новы рэйхстаг будзе рэакцыённы і тады сьмерць рабочай клясе, ці ён будзе левы—тады гора рэакцыі. Сярэдзіны ў новым рэйхстагу, відаць, ня будзе, інакш ня трэба было распускаць стары.

Стары рэйхстаг менавіта таму і быў распушчан, што ў яго не хапіла грошай перайсьці праз мяжу, ля якой апынулася Нямеччына.

Нямецкі капіталізм імкнецца да поўнага закабаляньня рабочых. З гэтай мэтай ён намеціў цэлы шэраг законаў і ў першую чаргу закон аб школах. У свой час мы пісалі на старонках «Савецкай Беларусі» аб гэтым дзівосным законапраэкце; таму зараз аб ім скажам толькі ў двух словах. Па праэкту кіруючай буржуазеі, школам трэба надаць канфэсыянальны (г. зн.—рэлігійны) характар. Гэтым аўтары законапраэкту дамагаюцца, каб моладзь Нямеччыны выхоўвалася ў духу рэлігійнага паслухмяньства і падначаленьня ўладзе. Дзякуючы гэтаму законапраэкту здарыўся раскол амаль што ва ўсіх буржуазных партыях. Буржуазная прэса страціла на яго столькі атраманту і друкарскай фарбы, як ні на водзін закон. Ніякай адназгоднасьці ня толькі ў рэйхстагу, але нават і сярод самаго ўраду нельга было дасягнуць і таму трэба было падумаць аб роспуску рэйхстагу.

Другім пытаньнем, якое вырашыла лёс старога рэйхстагу, зьяўляецца барацьба прадпрыёмцаў з рабочымі. Хто сачыў за жыцьцём Нямеччыны, той добра ведае, што ў працягу апошняга году ня было дня, каб у нямецкай прамысловасьці ня было большменш буйнага канфлікту. Бастуюць ці рабочыя, ці прадпрыёмцы, прычым барацьба гэта мае характар чыста эканамічны. Капіталісты хочуць як мага выкарыстаць рабочага, узаконіць дзесяцігадзінны рабочы дзень, ня даць яму адпачынку ад падаткаў і зьнішчыць у іх думку аб СССР. А рабочы патрабуе хлеба, васьмігадзіннага рабочага дню, пабудовы новых памяшканьняў, памяншэньня пэнсіі розным адстаўным правасхадзіцельствам і павялічэньня пэнсіі ахвярам вайны і беспрацоўя. Само сабой зразумела, што адмовіць рабочым у іх патрабаньні толькі на паперы нельга, таму буржуазея шукае такога рэйхстагу, які якнайхутчэй ажыцьцёвіў-бы цэлы шэраг законаў, якія выключаюць выхаваньне такіх «крамольнікаў, як сёньнешні пралетары».

Нажаль, мала даных за тое, што выбары 20 мая скончацца на карысьць рэвалюцыйнага пралетарыяту. Жах беспрацоўя і жабрацтва так цяжка ўплывае на нямецкага рабочага, што ён, часам баючыся страціць месца, не адважыцца выступіць проці волі прадпрыёмца.

А волю нямецкага (як і ўсякага іншага) прадпрыёмцы мы добра ведаем. У выніку зьявіцца выбарчы тэрор: будзеш галасаваць за камуністаў—страціш месца.

Перад выбаршчыкам рабочых квартаў 20 мая паўстане дылема страўніка ці ідэі.

Што пераможа—будзем бачыць.

Янка Б.

Бэрлін, 11-IУ—28.

Перад вясеньняй сяўбой.

Праца ідзе слаба.

У пачатку здавалася, што пасеўная кампанія ў нашым раёне разгорнецца ва ўсю. Зусім іншае прыходзіцца назіраць цяпер.

Праца па ачыстцы насеньня да самай вясны не вялася. Цяпер пачалі чысьціць. Зьбіраюцца сяляне і вязуць чысьціць, прывозяць — няспраўны «Трыер», варочайся назад.

Такія выпадкі былі ў Лагойскім і Янушкаўскім сельсаветах. Шмат дзе машыны ня спраўны. У Кораньскім сельсавеце не змаглі нават паправіць сіты, і машына ня можа працаваць. Лепш праца пастаўлена ў Слабадзкім с.-савеце. Там ужо ачышчана каля 2 тысяч пудоў насеньня. Загатоўка ідзе толькі ў Лагойскім крэдытным т-ве. Загатоўлена аўса 2700 пуд. (трэба па заданьню зарыхтаваць 3.500 п.). Ячменю зарыхтавана 600 пуд.—трэба было 400 пуд., лубіну 1000 пуд., канюшыны 40 пуд. і інш. У Янушкаўскім крэдытн. т-ве загатоўка ідзе дрэнна.

— Нам у Лагойску і Плешчаніцах ня выгадна купляць, бо каштуе дастаўка, а ў нас няма дзе ды і сьвірна няма ссыпаць.—бядуе старшыня Янушкаўскага крэдыт. т-ва.

Бядуе і сядзіць сабе спакойна. Па ягонаму выгадней будзе, калі поле застанецца не засеяным і беднаце ня будзе чым дапамагчы.

У Лагойскім крэд. т-ве лубіну дастаткова, а ў Янушкаўскім няма і апошняе не змагло дагаварыцца, каб здабыць сабе лубін.

Вялікае запатрабаваньне насельніцтва на лубін і лён-даўгунец, апошняга зусім няма. Белсельсаюз адказвае, што яго таксама няма і ня будзе.

Справа па кантрактацыі, за невялікім выключэньнем (Лагойск), толькі разгортваецца. У раёне маецца вінакурны завод, якому патрэбна 125 тыс. пудоў бульбы, а насельніцтву вельмі выгадна яе сеяць і трэба было-б пашырыць гэту культуру.

Нічога ня зроблена ў пашырэньні пасеўнай плошчы з боку сельсаветаў.

Камітэты ўзаемадапамогі, у большасьці (Кораньскі, Бяседзкі, Янушкаўскі) нічога ня робяць як у галіне спагнаньня пазык, так і сяброўскіх узносаў, ачысткі насеньня, яго загатоўкі і г. д.

Сельсаветы на пасеўную кампанію глядзяць праз пальцы У большасьці іх, нават, Лагойскім, які пад бокам РВК, па гэты дзень няма плянаў пасеўкампаніі і на пытаньне: што ў вас робіцца і што намечана зрабіць, спакойна адказваюць:

— Ня ведаем. Будзем выпрацоўваць плян!

Калі так праца будзе праводзіцца і надалей, дык пасеўная кампанія правоваліцца. Плян райённай камісіі аб арганізацыі ў райёне 9 калектываў, 2 машынных таварыстваў, 2 жывёлагадоўчых т-ваў, 4-х мэліярацыйных торфараспрацоўчых, 2 паказальных вучастка ў на асушцы балот, пераход на шматпольле і г. д.,—стаіць пад пагрозай невыкананьня.

Патрэбна райённай камісіі прыняць рашучыя меры ў адносінах да тых саветаў і асобных працаўнікоў, якія нядбайна адносяцца да справы пасеўнай кампаніі.

Я. К.

Лагойскі р., Меншчына.

А ў нас насеньне ня будзе ачышчана.

Надыходзіць вясеньняя сяўба. Усе камітэты сялянскай узаемадапамогі ўзяліся за падрыхтоўчую працу. Яны купляюць рознае насеньне, каб потым даць яго беднякам-сялянам. І наш камітэт клапаціцца, каб бядняк больш ня ішоў да заможніка кленчыць дапамогі, а каб сам мог засеяць свой кавалачак зямлі. Адно кепска з ачысткаю насеньня. Сяляне хочуць ачысьціць насеньне, але ў нашым КСУ няма трыера. У в. Блеўчыцах у аднаго грамадзяніна маецца трыер, вось наш старшыня КСУ запрасіў яго, каб дагаварыўся з сялянамі адносна ачысткі насеньня. Уласьнік трыера запрасіў з сялян па 5 к. за ачыстку 16 кілёграм (1 пуд) насеньня.

— За меншую цану чысьціць ня буду,—заявіў ён.

Сяляне давалі па 3 капейкі, але ён адмовіўся. У Капыльскім раёне па савхозах за ачыстку 16 кілёграм бяруць толькі 2 капейкі, а прыватнік захацеў аж па пяць капеек. З гэтае прычыны сяляне будуць сеяць неачышчаным насеньнем. **Я. М. Жылка**

Капыльскі раён.

Увага адсталым райёнам.

Бяз плянаў.

Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы ў нашым Бягомльскім раёне наогул праходзіць слаба. Райвыканком значна спазьніўся са складаньнем пляну сяўбы і толькі ў канцы сакавіка быў складзен плян і абмяркован на пленуме райвыканкому.

Сельсаветы да пасеўнай кампаніі адносьліся няўважліва. У большасьці сельсаветаў ніякіх плянаў няма,—абмежаваліся агульнымі пастановамі агітацыйнага характару.

Таксама трэба адзначыць, што райвыканком мала памагаў сельсаветам у вызначэньні канкрэтных мерапрыёмстваў да сяўбы.

Недахват насеньня.

Ачышчана насеньня ўсяго толькі 35 проц. заданьня. Гэта тлумачыцца тым, што машыны ў лютым і сакавіку ня былі поўнасьцю нагружаны.

Бягомльскі райён даў заяўку на 5 вагонаў насеньня, а атрымаў толькі 2 вагоны. Калі больш ня будзе прывезена насеньня, то райён поўнасьцю не абсеіцца, тым больш, што ў мінулым годзе быў недарод, асабліва аўсу і ячменю. Крэдытамі наогул райён забясьпечан, за выключэньнем крэдыту на коні, якіх у райёне не хапае.

88 проц. сох.

У Бягомльскім раёне калі 88 проц. сялянства карыстаецца сохамі. Гэты факт гаворыць аб вялікім запазданьні раёну. Глеба ў раёне вельмі каміністая, што можна лічыць галоўнай прычынай адсутнічаньня плугоў. А каменьня сяляне ня хочуць зьбіраць, яны гавораць:

— Земляўпарадкуйце нас, тады мы будзем ведаць, дзе наша зямля, зьбярэм каменьне і купім плугі.

Менскаму Акраза трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на гаспадарчае ўпарадкаваньне Бягомльскага раёну.

Плугі, якія ёсьць у раёне, сялянства ня купляе таму, што яны ня зусім падыходзяць да ўмоў глебы і таму, што гэтыя плугі нядаўна паганіді ў газэтах.

Што затрымлівае калектывізацыю.

У гэтым годзе па пляну намечана арганізаваць 2 калектывы і некалькі с.-г. т-ваў. Гэтыя 2 калектывы ўжо арганізаваны і яшчэ ёсьць магчымасьць арганізаваць 2 калектывы. Як відаць, у сялян маецца імкненьне да калектывізацыі. Але тут трэба адзначыць адзін недахват—гэта адсутнічаньне тэхнічных указаньняў з боку зямельных органаў, аб парадку афармленьня арганізуемых калектываў. Апрача гэтага, ва мясцох ня выконваюцца дырэктывы партыі і ўраду аб уключэньні калектываў у плян земляўпарадкаваньня ў першую чаргу.

Таксама на мясцох няма статутаў калектываў і арцеляў. Белсельсаюзу трэба зьвярнуць на гэта ўвагу. **З—і.**

Бягомльскі р., Меншчына.

Затрымліваюць калектывізацыю.

У вёсцы Нова-Мазалова, Лукаўскага с.-с., увосень 1927 году пры земляўпарадкаваньні арганізаваліся два калектывы і зімой 28 году трэці. Калектывы імкнуца хутчэй пачаць будаваць сваю гаспадарку, але на шляху сваім сустрэлі шмат перашкодаў. Каморнік, адводзячы зямлю калектыву „Чырвоны Остраў", адвёў яе вакол саду, які знаходзіўся ў арэндзе прыватнікаў. Калі праэкт земляўпарадкаваньня пачалі зацьвярджаць у раённым зямельным судзе, арандатары выступілі на судзе і адсудзілі ад калектыву зямлю. Справа дайшла да акруговага зямельнага суду, які, разабраўшы справу на месцы, вярнуў зямлю і частку саду калектыву. Калектыў думаў, што справа кончана, можна ставіць свае будынкі і рыхтавацца да пасеву. Але выйшла ня так. Калі паехалі ў РВК спытацца, ці можна сяліцца на новым мейсцы, то ім адказалі:

— Не, мы вас ізноў будзем земляўпарадкоўваць, бо да суда сяліцца нельга.

Калі калектыўцы паказалі газэту «Савецкая Беларусь» за № 75 ад 29-3—28 году, дзе была пастанова Савету Народных Камісараў аб тым, што дзяржаўныя сады павінны перадавацца калектывам, то ім адказалі, што гэты закон ня хутка будзе праводзіцца ў жыцьцё. Такім чынам калектыўцы павінны чакаць, калі да іх ізноў прыедзе каморнік, калі ім дадуць зямлю, а там ізноў суд, валакіта і так без канца. А сеяць прыдзецца ізноў на трохпалёўцы, а калектыў у нас будзе пры нашых парадках у 1940 годзе.

Вяршынін.

Жлобінскі р., Бабруйшчына.

СЯЛЯНЕ ПЕРАХОДЗЯЦЬ НА КАЛЕКТЫЎНАЕ ЖЫЦЬЦЁ.

Лупалаўскі райён яшчэ ў дарэвалюцыйны час займаў у Магілеўшчыне першае месца па земляўпарадкаваньню, але тады сялянства пераходзіла па хутары. Пры савецкай уладзе сяляне нашага райёну таксама імкнуліся да хутарскога земляўпарадкаваньня.

Але ў апошнія гады наша вёска пачала патроху заглядвацца на калектыўныя гаспадаркі, якія арганізаваліся па акрузе. Зараз-жа, дзякуючы добра пастаўленай тлумачыцельнай працы, сярод сялянства назіраецца значны пералом да пераходу на калектыўныя гаспадаркі.

11 вёсак, якія рыхтуюцца да земляўпарадкаваньня, ня толькі ня думаюць аб хутарох, а жадаюць перайсьці на калектыўнае жыцьцё.

У вёсцы Малыя-Амхінчы арганізавалася камуна „Серп і Молат", якая ўжо аформіла ўстаў і прыступае да працы. У гэтай-жа вёсцы набіраецца і другая група, якая ўжо ўзялася за афармленьне калгасу. У вёсцы Сафійск сяляне арганізаваліся ў сельска-гаспадарчую арцель.

З вёсак прыходзяць у райвыканком цэлыя дэлегацыі для высьвятленьня пытаньняў, маючых сувязь з арганізацыяй калгасаў.

Нават на даўнейшых сталыпінскіх хутарох ёсьць выпадкі, калі сяляне жадаюць арганізавацца ў калектыўныя гаспадаркі. **Калектывісты.**

м. Лупалава, Магілеўскай акр.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Самаабкладаньне на Случчыне.

Слуцак. Па ўсіх насельных пунктах Слуцкага райёну (за выключэньнем 18 вёсак, у якіх сходы праводзіліся па 2—3 разы) самаабкладаньне ўжо праведзена.

У тых насельных пунктах, дзе значную колькасьць насельніцтва складае беднота, самаабкладаньне прымалася з першага сходу, асабліва там, дзе беднота была падрыхтавана, дзе былі праведзены сходы беднаты.

Не ва ўсіх вёсках сяляне прынялі самаабкладаньне ў разьмеры 35 проц. агульнай сумы с.-г. падатку. Так, 3 вёскі правялі самаабкладаньне на 25 проц., 1 вёска—20 проц., 7 дробных насельных пунктаў—15 процантаў і 2—10 процантаў, 268 насельных пунктаў прынялі самаабкладаньні ў разьмеры 35 проц. толькі 1 вёска—38 проц.

На 9 красавіка самаабкладаньне вылічана ў суме 34.121 руб. 87 к. На 9 красавіка ад самаабкладаньня паступіла 5570 руб. грашмі і адпрацавана беднатой 1032 р. 3 кап.

Сродкі ад самаабкладаньня мяркуюцца скарыстаць на рамонт і пабудову новых школ, на ўтрыманьне адна фэльчарскага пункту і рамонт лечэбных устаноў, пабудову лазьні. Таксама частка сродкаў будзе скарыстана на арганізацыю злучных пунктаў і прыдбаньне аднаго зерначыстнага абазу. У м. Леніна мае быць праклаўзе брукаваная дарога працягам каля кілёмэтраў. У Анговіцкім с. с. будзе пабудован будынак для сельсавету і адрамантавана хата-чытальня і г. д.

ЯК ПАСТУПАЮЦЬ СРОДКІ ПА САМААБКЛАДАНЬНЮ.

Бабруйск, 19-4. Паводле апошніх вестак па Бабруйшчыне паступіла самаабкладаньня 63.148 руб. Наогулжа, самаабкладаньне па акрузе прынята ў суме 373.669 руб. Такім чынам дагэтуль сабрана толькі 16,8 проц. прынятай сумы.

Ворша, 19-3. Самаабкладаньне па акрузе прынята ў суме 350.002 руб. Кампанія па збору сродкаў па самаабкладаньню праходзіць досыць паспяхова,—да 15 красавіка паступіла ўжо 169.923 руб., што складае прыблізна каля 50 проц. прынятай сумы.

Віцебск, 19-4. Водлуг вестак на 15 красавіка па Віцебскай акрузе паступіла па самаабкладаньню 33.610 р., што складае прынятай сумы толькі 15 проц.

Агнятрывалая справа на Бабруйшчыне.

Нашы посьпехі і недахваты.

Бабруйск. Справа агнятрывалага будаўніцтва па нашай акрузе — справа занадта маладая, але яна дае практычныя вынікі і пагэтаму наглядаецца цяга сялянства да арганізацыі ў агнетрывалыя таварыствы і да пабудовы агнятрывалых будынкаў Аб гэтым кажуць лічбы. Ужо ў бягучым годзе арганізавалася 7 новых сялянскіх агнятрывалых таварыстваў і 79 асоб узялі праз крэдытныя таварыствы пазыкі на пабудову агнятрывалых хат і хлявоў.

Ідучы насустрач запатр бавальням вёскі, існуючыя таварыствы шырока разгортваюць працу па вырабу будаўнічых матар'ялаў. 19 таварыствамі акругі за бягучы сезон будзе выпрацавана 4250 штук бэтонных кругоў для калодзежаў, 210 тысяч штук чарапіцы, 1200 тысяч штук цэглы.

У працы сваёй таварыствы маюць значныя перашкоды з-за адсутнасьці станкоў для вырабу цэглы. Заказы на іх ня выконваюцца своячасова і гэта псуе ўсю справу.

Вялікая ўвага сёлета зварачаецца на пабудову бэтонных калодзежаў. Іх мяркуецца пабудаваць на вёсцы 225 штук, на што вызначан крэдыт у 10 тысяч рублёў.

Акрземаддзел арганізоўвае курсы па падрыхтоўцы спэцыялістых па выпрацоўцы агнятрывалых матар'ялаў. Побач з гэтым будзе праведзен конкурс на лепшы агнятрывалы будынак.

Па дзяржаўнаму агнятрываламу будаўніцтву сёлета на сродкімясцовага дзяржаўнага бюджэту мяркуецца пабудаваць 5 будынкаў (агнятрывалых) пад школы, 1 пад аграпункт і 2 пад ветэрынарныя пункты. Адны райвыканкомы: Жлобінскі, Рагачэўскі, Чырвона-Слабодзкі, Слуцкі і Глускі, на якіх ажыцьць абавязак падрыхтоўкі матар'ялаў для пабудовы, нічагутанькі да сёньняшняга дня не загатовілі. Вядома, пры такім стане вішчы плян будаўніцтва будзе сарван.

Чырвона-Слабодзкі райён нават умудрыўся ня выкупіць вагон цэменту, які быў паслан Акрза спэцыяльна да будаўнічых работ у гэтым райёне.

Адным словам, падрыхтоўку райвыканкомы праспалі і меркаваньні заставуцца меркаваньнямі.

Прыемным зьявішчам на фоне гэтай нядбайнасьці трэба зазначыць тое, што сяляне в. Ялчыцы, Жлобінскага райёну сёлета пабудуюць самі агнятрывалы будынак для хаты - чытальні. Гэта яшчэ раз сьцьвярджае той факт, што справа агнятрывалага будаўніцтва сялянствам разумеецца, як карысная рэч. А гэта абяцае печвае шпаркае пашырэньне гэтай справы.

А. Дамброўскі.

БУДАЎНІЦТВА НА СІЛІКАТНЫМ ЗАВОДЗЕ.

Клімавічы, 18-4. Ужо атрымана апошняя партыя замежнага абсталяваньня для Клімавіцкага сілікатнага заводу. Гэты завод будзе самым буйным у БССР і будзе выпрацоўваць белую цэглу, якая па сваёй якасьці будзе лепш чырвонай і дзешавей за яе. У бягучым будаўнічым сезоне гэты завод мае быць закончан і пушчан у ход.

ВУЧЭБНАЯ МАЙСТЭРНЯ ПА АГНЯТРЫВАЛЫМ БУДАЎНІЦТВЕ.

Гомель, 19-4. Арганізуецца вучэбна-вопытная майстэрня па агнятрывалым будаўніцтве. Для майстэрні выдзяляецца вучастак, які дазваляе праводзіць вопытную працу ў больш шырокім маштабе. Для падрыхтоўкі майстроў па агнятрывалым будаўніцтве будуць арганізаваны 3-хмесяч. курсы.

Дасьледаваньне сел. гаспадаркі

АРГАНІЗАЦЫЯ ПАЛЕСКАЙ БАЛОТНАЙ СТАНЦЫІ.

Сёлета на асушаных масывах Мар'інскага Балота арганізуецца аддзяленьне Палескай Балотнай Станцыі, якая ставіць сваёй мэтай вывучэньне асаблівасьцяў глебы асушанага пад калёнізацыйны фонд балота.

Усімі работамі станцыі будзе кіраваць Менская Балотная Станцыя.

ПАШЫРЭНЬНЕ РЫБАРАЗЬВЯДЗЕНЬНЯ.

Дзеля вывучэньня магчымасьцяў шырокага рыбаразьвядзеньня ў БССР Наркамзем арганізуе сёлета экспэдыцыю па вывучэньні ўсіх нашых вадаёмаў.

Другая экспэдыцыя накіроўваецца на Чудскае возера для загатоўкі 20 мільёнаў ікрынак чудзкага сіга.

ВЫВУЧЭНЬНЕ ШКОДНАСЬЦІ РАБАКОЎ.

Дзеля вывучэньня шкоднасьці рабакоў і паразытаў кінак чалавека і жывёлы Наркамзем супольна з Пар. Кам. Аховы Здароўя арганізуе ў наступным годзе спэцыяльную экспэдыцыю з удзелам вэтэрынараў і медыкаў. Гэта экспэдыцыя ставіць сваёй задачай, па прыкладу іншых рэспублік СССР, вывучыць тых шкодных паразытаў, якія распаўсюджаны ў БССР і да гэтага часу ня вывучаны.

ЗОЛАТА У АМЭРЫЦЫ.

I.

Элізэ Рэклю калісьці назваў беларусаў земнаводнымі. Напалеон, які не паслухаўся мудрае парады сваіх генэралаў, завяраўшых, што расейцы здольны адступаць да Камчаткі, ужо ў Гарадзенскай губ. пазнаў краіну, у якой 5-ая стыхія-балота. Географы, прадметам заняткаў якіх зьяўлялася апісаньне „Земли Русской", раз назаўсёды склалі вельмі невяселае ўяўленьне аб частцы гэтай зямлі. Некрасаў у «Железной дороге» намаляваў беларуса высокім, худым, з запаўшымі грудзьмі, якія здольны націскаць толькі на рыдлёўку і ня больш. З падручнікаў географіі ня толькі «тутэйшых» ведалі, што лапці гэта адзіны абутак беларуса, аб гэтым ведаў амаль увесь сьвет. Паважаныя географы забыліся толькі расказаць нам, што Беларусь надавычайна багатая сыравінаю, і толькі імпэрыялістычная вайна выявіла, што гарбарні ў Смаргоні, Берасьці, і Беластоку былі ўжо ня зусім кепскія. Вось канкрэтны доказ, які робіць прарыў у лягендзе аб беднасьці Беларусі і ў прыроджанай прыхільнасьці беларуса да лапцёў. Справа ня ў тым што Беларусь бедная. Байкі аб беднасьці нашае краіны былі міфам каштоўным і неабходным пануючым клясам. Гэтымі байкамі яны апраўдвалі тыя барбарскія ўмовы, у якіх знаходзілася да рэвалюцыі беларуская вёска і рабочая частка гораду.

Мы сёньня з вялікаю доляю скэпсісу адносімся да таго завяраньня, што каўтун—беларуская нацыянальная хвароба і што беларусы ня любяць мыцца ў лазьні. У нас ужо выяўляецца недавер'е да людзей, якія любяць гаварыць на тэму аб векавой забітасьці беларуса і аб тым, што прыродныя ўмовы не даюць магчымасьці для шпаркага культурнага і эканамічнага адраджэньня краіны.

Мы цьвёрда ведаем, што мы будуем сацыялізм, што нельга падзяляць эканомікі Беларусі ад эканомікі Сав. Саюзу, што Савецкі Саюз дапамагае і яшчэ больш дапаможа нам у будучым і што, нарэшце, лягенда аб беднасьці Беларусі ёсьць перажытак старога прыгоннага пэрыяду нашай гісторыі. Аднак яшчэ ня ўсе ўяўляюць сабе сэнс і ўсю шкоду гэтай лягенды. Кастрычнікавая рэвалюцыя, якая зьнішчыла паўфэадальныя, прыгонныя адносіны на Беларусі, разьбіла асновы панаваньня капіталізму,—зьнішчыла і лягенду аб векавой беднасьці краіны. Не зважаючы на гэта яшчэ да сёньняшняга дню гэтая лягенда пазбаўляе творчага духу многіх і многіх. Уявіце сабе, што доктар са злымі намерам ці па несьвядомасьці будзе гаварыць чалавеку, які ў мінулым перанёс цяжкую хваробу, што пэрспэктывы ў яго для адпачыньня здароўя і росквіту арганізму вельмі малыя. Калі такі ўплыў будзе цягнуцца досыць доўга, дык чалавек слабахарактарны можа падпасьці гэтаму ўплыву, зрабіцца апатычным і ніколі ня здолее выканаць задач, якія будуць стаяць на яго жыцьцёвым шляху. Так і з завярэньнем аб беднасьці беларускага краю. Па-папугайску паўтараючы, што мы бедныя, што натуральныя багацьці краю нязначныя і што таму мы ня можам спадзявацца на такі росквіт народнае гаспадаркі, як, напрыклад, на Украіне—«жычлівцы зямлі беларускай»,—ня ўлічваюць таго, што яны робяць надзвычайна шкодную справу. У той час, калі камуністычная партыя і ўлада будзяць творчую энэргію мас, арганізуюць і праводзяць нячуванае на Беларусі гаспадарчае і культурнае будаўніцтва, вядуць да нячуваных вышынь беларускую культуру, пралетарскім плугам перавораваюць перажыткі барбарства дакастрычнікавага пэрыяду,—у гэты самы час асобныя галасы пастарому разважаюць аб адсутнасьці пэрспэктыў у Савецкай Беларусі. Паўтараюць старыя сказы аб нашай беднасьці і гэтым самым падрываюць волю і энэргію калі ня мас, дык значных кадраў выхадцаў з вёскі, якія шпарка ўцягваюцца ў арбіту гарадзкога жыцьця.

Але, мы бедныя. У мінулым—земнаводныя, сотні гадоў прыгнечаныя польскім абшарнікам і расейскім чыноўнікам, абмежаваныя ў сваім разьвіцьці 5-ай стыхіяй—балотам, мы былі вельмі бедныя. І калі сёньня ў Беларусі сельская гаспадарка мае жывёлаводчы ўхіл, а нам прыходзіцца ўвозіць масла, калі Беларусь лічыцца лясной краінай, а ў асобных раёнах не хапае дроў для апалу і будоўлі, дык гэтыя факты, якія гавораць аб нашых патрэбах, ніколькі яшчэ ня сьведчаць аб беднасьці нашай краіны. У першую чаргу яны гавораць аб адсутнасьці культуры ў шырокіх колах насельніцтва, аб тым, што гэтая адсутнасьць культуры не дазваляе з максымальнай выгадай выкарыстаць тыя эканамічныя магчымасьці, якія ёсьць у нас. Асабліва пуката гэта адчуваецца на вёсцы.

Некультурнасьць беларускага селяніна—вось прычына, чаму край, увяўшы курс на жывёлаводчае разьвіцьцё сельскай гаспадаркі, павінен прывозіць сабе масла. А хіба не некультурнасьць зьяўляецца прычынаю таго, што сялянства ў асобных раёнах пакутуе ад адсутнасьці апалу ў той час, калі мы маем міліёны дзесяцін забалочанай плошчы з вялічэзнымі запасамі торфу.

Установка, дазеная партыяй,—лёзунг «культурнай рэвалюцыі» мо больш, як дзе патрэбны ў Савецкай Беларусі. Культурная рэвалюцыя даб'е лягенду аб нашай беднасьці, дапаможа нам і ў эканоміцы і ў культуры стварыць каштоўнасьці, вартыя творчасьці вялікай клясы.

Патрэбна толькі належнае разуменьне ўсіх тых вялічэзных задач, пастаўленых эпохаю перад намі, патрэбна належная ўвага да тых, часта «дробязяў», якія вельмі часта адыгрываюць вялікую ролю ў справе хутчэйшага выраішэньня гэтых задач.

II.

У 1872 годзе быў складзены генэралам Жылінскім праэкт асушкі Беларускага Палесься.

Аб працы экспэдыцыі Жылінскага ведаюць толькі вузкія спэцыялісты. А між тым яна заслугоўвае значнай увагі таму, што гэта была першая мэліярацыйная праца ў Палессі і прытым вельмі вялікая.

Працяг галоўных і бакавых каналаў, праведзеных экспэдыцыяй да канца 1897 г., складаў 4.519 вёрст. Каналізаваная плошча Палесься складала да таго часу 2.855.000 дзесяцін. У выніку каналізацыі на месцы ранейшага непадступнага балота зьявілася 355.000 дзесяцін сенажаці, 115.000 дзесяцін ворнай зямлі, гародаў і сядзібы. Таксама асушана 530.000 дзесяцін забалочанага лесу. На працу па каналізацыі да 1897 г. было выдадзена 3.806.000 рублёў.

Ведаць аб працы гэтай экспэдыцыі мы павінны яшчэ і таму, што «спачатку асушваньне праводзілася сыстэматычна, пачынаючы з нізоўя рэк, але пазьней праца адбывалася толькі ў скарбовых дачах, якія маглі даць значную выгоду і дзе водныя каналы спрыялі збыту каштоўнага скарбовага лесу.*)

Як бачыце, «скарбовыя» інтарэсы ўсюды перамагаюць, а пра інтарэсы паляшукоў, адзіным нацыянальным гонарам якіх мог быць тады каўтун, нешта ня чуваць было. Праўда, праца экспэдыцыі Жылінскага ў цэлым для беларускага краю была каштоўнаю, але ў аснове яна мела, пераважна, інтарэс «скарбовы» і памешчыцкі. У гэтым прынцыповая розьніца між мэліярацыйнаю працаю на Беларусі ў канцы 19-га стагодзьдзя і мэліярацыяй, якая праводзіцца зараз савецкаю ўладаю.

Сучасная мэліярацыя адрозьніваецца ад ранейшай сваім грамадзка-палітычным і эканамічным значэньнем. Сваёю вялічынёю, размахам і заканчонасьцю наша савецкая мэліярацыя далёка выперадзіць працу экспэдыцыі 19-га стагодзьдзя. І гэта будзе ня толькі таму, што ва ўмовах Беларусі мэліярацыя зьяўляецца зараз галоўнай задачай, што мэліярацыйная праца ў нас прызнана працаю ўсесаюзнага значэньня, але і таму, што гэтая праца праводзіцца выключна ў інтарэсах працоўнага жыхарства, што на гэтай працы мы аб'яднаем у пачатковыя вытворчыя каапэрацыйныя арганізацыі сотні тысяч разрозьненых сялянскіх гаспадарак Савецкай Беларусі.

Аб значэньні мэліярацыі партыя і ўлада гаварылі многа. Кожны камсамолец і нават піанэр скажа вам, што мэліярацыя ў Савецкай Беларусі павінна вызваліць ад непраходных балот два з лішкам міліёны дзесяцін зямлі, але бяда ў тым, што, не зважаючы на выразную вялізарнасьць гэтай задачы, шырокія масы яшчэ не зразумелі тых значных эканамічных выгод, якія дадуць гэтыя адроджаныя ў будучыне міліёны дзесяцін.

Мэліярацыя—ня толькі адзін з шляхоў ліквідацыі аграрнай перанаселенасьці, палепшаньня і шпаркага росту нашай лясной гаспадаркі, ня толькі ўзмацненьня тэмпу разьвіцьця жывёлаводзтва, мэліярацыя—гэта першы этап на шляху да магутнага росту сацыялістычнай прамысловасьці Савецкай Беларусі.

Мы прызвычаіліся гаварыць пра беднасьць Беларусі на карысныя выкапні. Праўда, мы ня маем каменнага вугалю, але затое торф, водлуг прыблізных падсумаваньняў, можа ў працягу 300 гадоў забясьпечыць нас рэсурсамі апалу пры ўмове, калі Беларусь будзе краем больш індустрыяльным, чымся Нямеччына. Асінстрой—толькі пачатак, уступная частка да таго гімну машын, які абавязкова пачуюць далейшыя пакаленьні Беларусі. Мы не памылімся, калі скажам, што зразуменьне важнасьці мэліярацыйнай працы ў нашым краі, усьвядомленьне вялізарнай карысьці, якую яна павінна даць працоўным, поўнасьцю зьнішчае лягенду пра беднасьць Беларусі. Яно запоўніць творчым уздымам разуменьне кожнага чалавека, які хоча аддаць сваю энэргію сацыялістычнай перабудове Савецкай Беларусі.

Савецкая ўлада затраціла на мэліярацыю з 1923 да 1928 г. 5 міліёнаў руб.; актыўны ўдзел у мэліярацыі бярэ і сялянства, якое працай

НАРАДА КАМУНІСТАЎ ДЛЯ АБГАВАРЭНЬНЯ ПЫТАНЬНЯЎ АБ АРГАНІЗАЦЫІ І БОЛЬШЫМ УЦЯГНЕНЬНІ ПРАЦОЎНЫХ МАС У СПРАВУ САДЗЕЙНІЧАНЬНЯ КАПІТАЛЬНАМУ БУДАЎНІЦТВУ І РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ ВЫТВОРЧАСЬЦІ,—ЯКАЯ МЕЛА АДБЫЦЦА 20 КРАСАВІКА, —ПЕРАНОСІЦЦА НА 26 КРАСАВІКА І АДБУДЗЕЦЦА А 7-Й АДЗІНЕ ВЕЧАРА Ў ЗАЛІ ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ ЦК КП(б)Б.

НА НАРАДУ ЗАПРАШАЮЦЦА: ЧЛЕНЫ ЭКАНАМІЧНАЙ НАРАДЫ, ЧЛЕНЫ КАЛЕГІІ РСІ, ФР. ПРЭЗЫДЫУМУ ЦСПСБ, ЧЛЕНЫ ПРЭЗЫДЫУМУ ВСНГ, ДЫРЭКТАРЫ ТРЭСТАЎ І ІХ НАМЕСЬНІКІ, РЭДАКТАРЫ ГАЗЭТ, ПРАДСТАЎНІКІ МЕНСКАГА АК І АК КПБ, СЭКРАТАРЫ ЛЯХАЎСКАГА, ГАРАДЗКОГА І КАСТРЫЧНІКАЎСКАГА РАЙКОМУ КПБ.

Сэкратар ЦК КП(б)Б ВАСІЛЕВІЧ.

На камунах і арцелях.

СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЯ АРЦЕЛЬ „НАДЕЖДА“.

(Парыцкі р., Бабруйскае акругі).

Арцель арганізавана ў 1921 годзе па ініцыятыве групы сялян вёскі Парычы. Ініцыятары гэтае групы сяляне Шымкевіч і Белы і зараз знаходзяцца ў арцелі.

У сучасны момант у арцелі маецца 15 сем'яў, з іх: 1 рабочы, 7 беднякоў і 7 сераднякоў.

Калі да моманту арганізацыі арцелі ў яе складзе ня было ні камуністаў, ні камсамольцаў, дык зараз у арцелі—2 члены і 2 кандыдаты КПБ і 2 камсамольцы. Трэба адзначыць значны ўплыў партыйцаў на гаспадарчае і ўнутранае жыцьцё арцелі. Камуністы карыстаюцца аўтарытэтам і добра выяўляюць сябе, асабліва ў працы праўленьня.

Стан гаспадаркі арцелі.

Арцель мае 295 дзесяцін зямлі, у гым ліку: ральлі 90 дзес., сенажаці заліўной—35 дзес., саду—19 дзес., сядзіба—6 дзес., выган—33 дзес., лесу мясцовага значэньня—86 дзес. і невыгоднай зямлі—25 дзес.

Правільнага севазвароту арцель да гэтага часу яшчэ ня мае. У 1924 годзе быў намечаны 8-мінольны севазварот, які немагчыма было правесьці на якасьці зямлі. У 1927 годзе спрабавалі ўстанавіць больш ці менш правільны чатырохпольны севазварот.

Пры наліччы некаторых палепшаньняў, жывёлаводзтва пастаўлена яшчэ незадавальняюча. Маецца 27 кароў, з іх толькі 4 мэтысы, рэшта—мясцовай простай пароды.

Сьвіньняў—25 і 15 маладняка, яркшырскай пароды—2 шт. Абора досыць халодная. Маюцца простыя карэтушкі на тыпу дацкіх. Моцныя харчы ў арцелі ня ўжываюцца.

Вялікі сад арцелі даглядаецца добра. Штогод абразаюць гальлё, абмазваюць, апырскваюць і ўгнойваюць дрэвы. Закладзен пладовы гадавальнік. Валавы прыбытак ад саду складае 5.559 руб.

Арцель пабудавала ў 1927 годзе цагельню, вытворчая праграма якой разьлічана на 100.000 цаглін. Сёлета выпрацавана 47.000 цаглін.

Слаба забясьпечана арцель цягавай сілай: маецца ўсяго 9 коняй мясцовай пароды. Лепш забясьпечана арцель інвэнтаром. Арцель мае: конную малатарню, сенакасілку, жняярку, веялку, саламарэзку. Увесь гэты інвэнтар набыты арцельлю. Арцель пабудавала новы ток, адрамантавала адрыну.

Памяшканьні маюцца ў неабходнай колькасьці. У гэтай арцелі памяшканьні лепш абсталяваны, як у большасьці калектыўных гаспадарак: атынкаваны, пабелены ці абклеены шпалерамі. Памяшканьні ўтрымліваюцца чыста.

Усё гэта сьведчыць аб гаспадарчым узмацненьні арцелі.

На шляху да камуны.

Уся маемасьць арцелі аграмаджана. Працэс аграмаджаньня праходзіў досыць марудна. У 1924 годзе аграмаджаны коні, у 1925 годзе—каровы, у 1926 г.—сьвіньні. У сучасны момант уласнасьцю паасобных адзінак засталося толькі птаства. Нядаўна пастаноўлена арганізаваць агульнае харчаваньне. У непадзельны капітал у 1927 годзе адлічана 2176 руб., а разам з ранейшымі адлічэньнямі гэты капітал складае 3292 р. Такім чынам з гэтага відаць, што арцель знаходзіцца на шляху да перарастаньня ў камуну, пры ўмове, калі ня будзе паспаблена кіраўніцтва і дапамога арцелі.

Узаемаадносіны з сялянствам.

Да гэтага часу ўплыў арцелі на акаляючае сялянства яшчэ слабы, але ён пачынае ўзмацняцца, асабліва з 1927 г. Значна ўзмацнілася цяга акаляючага сялянства ў калектыўныя гаспадаркі. Пададзена 16 заяў аб прыняцьці ў арцель. Значна павялічылася колькасьць вусных заяў.

У мінулым годзе арцель аказала насельніцтву наступную дапамогу: пакрыла бясплатна 45 галоў жывёлы, на ільготных умовах—25 галоў, абменена на ільготных умовах зярно 40 сялянам.

Члены арцелі прымаюць актыўны ўдзел у працы мясцовых савецкіх каапэрацыйных арганізацый.

Культурна-масавая праца.

Культурна-масавая праца зьяўляецца слабым вучасткам у арцелі. Пя гледзячы на тое, што маецца 7 няпісьменных і 22 малапісьменных, праца па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці праводзіцца вельмі слаба. Чырвонага кутку ў арцелі няма. Маецца сельска-гаспадарчая бібліятэчка, але яна не панаўняецца. Зусім дрэнна стаіць справа з працаю сярод жанчын. Дэлегаткі ў арцелі не вылучаюцца, райарганізатар сярод жанчын правёў толькі адзін сход у зьвязку з падрыхтоўкаю да перавыбараў саветаў.

Райпалітасьветарганізатар зусім не вядзе працы ў арцелі. Няма плякатаў і лёзунгаў па нядаўна прайшоўшых паліткампаніях.

Кіраўніцтва арцелі.

Кіраўніцтва і абслугоўваньне арцелі пастаўлена дрэнна. За апошні год райаграном наведаў арцель 6 разоў, наведаў арцель і вучасткові агранам. Інструктар акрсельсаюзу быў у арцелі ў працягу году 5 разоў. Ён склаў гадовую справаздачу і вытворчы плян.

Члены арцелі зазначаюць па няўважлівыя адносіны акруговых зямельных органаў да арцелі. Арцель хадайнічала аб перадачы 2-х дзесяцін зямлі, на якіх знаходзяцца цагельня і аб зьмяншэньні арэндай платы за завод, якая бярэцца ў разьмеры 300 р. Гэта хадайніцтва яшчэ не здаволена.

І. Дорахаў.

НА БАРАЦЬБУ З ТРЫХІНЭЛЁЗАМ.

У ГОМЕЛЬСКАЙ І БАБРУЙСКАЙ АКРУГАХ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА ПАШЫРАНА ХВАРОБА ТРЫХІНЭЛЁЗ. —ТРЭБА ЎЖЫЦЬ РАШУЧЫЯ МЕРЫ ДА БАРАЦЬБЫ З ГЭТАЙ ХВАРОБАЙ.—НЕАБХОДНА ЎЗМАЦНІЦЬ САНІТАРНЫ АГЛЯД СЬВІНІНЫ.

Трыхінэлёзмам называецца від рабака, які пападае ў арганізм чалавека пры ўжываньні дрэнна прыгатаванага сьвінога мяса, заражонага трыхінэлёзам. Гэта вельмі шкодная хвароба, і часта ад яе цяжка вылечыцца. У Гомельскай і Бабруйскай акругах у апошнія часы заўважан значны лік хворых людзей трыхінэлёзам: у Бабруйскай акрузе ўжо зарэгістравана 215, а ў Гомельскай—50 хворых. У Бабруйскай акрузе адна трыхінэлёзная сьвіньня прыпадае на 107 здаровых, у Гомельскай адна хворая на 48 здаровых, у Віцебскай адна на 2700, у Менскай—адна на 1600 і г. д. Па процанту хворых сьвіней Гомельская і Бабруйская акругі перавышаюць усе іншыя райёны СССР, і гэтыя акругі трэба абвясьціць пагражаючымі па распаўсюджваньні гэтай хваробы сярод людзей.

Спэцыяльная нарада з удзелам вэтэрынарных і мэдыцынскіх працаўнікоў намеціла цэлы шэраг мерапрыёмстваў па барацьбе з трыхінэлёзам. Тут мала толькі адных санітарных і прафілактычных мер: вакол гэтага пытаньня трэба згуртаваць шырокую грамадзкую думку, каб само насельніцтва дапамагала органам санітарыі весьці барацьбу з гэтай шкоднай хваробай.

Адным з мерапрыёмстваў у гэтай галіне зьяўляецца пашырэньне сеткі вэтэрынарных доктарскіх вучасткаў, у першую чаргу ў Гомельскай і Бабруйскай акругах, і арганізацыя трыхінэлёскопіі (выяўленьне трыхінэлёзу) па ўсіх разьніцах, дзе колюць сьвіней. Поруч з гэтым трэба шырока разьвінуць кампанію па азнаямленьні насельніцтва з прычынамі распаўсюджваньня трыхінэлёзу, а таксама і ўжываньне прафілактычных мер супроць гэтай хваробы шляхам арганізацыі лекцый, дакладаў, гутарак і інш.

Дзеля паленшаньня справы трыхінэлёскопіі па разьніцах і мясакантрольных станцыях пастаноўлена арганізаваць курсы па перакваліфікацыі работнікаў, якія працуюць па трыхінэлёскопіі. З мэтай-жа бясшкоднага выкарыстаньня ўмоўнагодных мясных прадуктаў пастаноўлена ўвесьці па ўсіх гарадзкіх разьніцах стэрылізатары дзеля абясшкоджваньня іх.

Для продажу такіх прадуктаў трэба адчыніць асобыя крамкі па заходнеэўрапейскім спосабу, якія называюцца фрэйбанкамі.

Да гэтага часу ў нашых разьніцах мала зьвярталася ўвагі на належнае выкарыстаньне канфіскатаў (мяса, нягоднае да ўжываньня) у тым ліку і сьвіных туш, заражаных трыхінэлёзам. Пастаноўлена ўжываць па ўсіх гарадзкіх разьніцах апараты для ўтылізацыі канфіскатаў.

На глебе канфіскацыі заражаных трэхінэлёзам сьвіных туш могуць мець вялікія страты дзяржаўныя, каапэрацыйныя органы і паасобныя сяляне. З гэтае прычыны пастаноўлена ўзьняць хадайніцтва перад СНК БССР аб увядзеньні абавязковага страхаваньня жывёлы, якая падлягае продажу на мяса, у першую чаргу сьвіней, ва ўсіх разьніцах і мяса-кантрольных станцыях, якія знаходзяцца пад сталым вэтэрынарна-санітарным наглядам.

Таксама пастаноўлена прыняць належныя меры да палепшаньня ўмоў утрыманьня сьвіней, каб апошнія не паядалі трупаў пацукоў, кошак і розных адкідаў, заражоных трыхінэлёзам.

УЗМАЦНІМ АБАРОНУ КРАІНЫ САВЕТАЎ.

ВЁСКА ЯШЧЭ НЯ ПРЫЦЯГНУТА ДА ПРАКТЫЧНАГА ЎДЗЕЛУ Ў АБАРОНЕ КРАІНЫ. СТРАЛКОВЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ ЎЛЕТКУ.

Як рыхтаваць вёску да абароны.

Калі ў горадзе ўжо намецілася тая ці іншая сыстэма ў працы, у ТДА-Авіяхім вызначыліся яе формы і г. д., дык у вёсцы мы яшчэ маем шмат працы.

Тут нам трэба вырашыць цэлы шэраг практычных пытаньняў, якія павінны быць праведзены ў жыцьцё ў працэсе самой працы.

Па якому шляху трэба ісьці? Што трэба рабіць? Якія неабходны мерапрыёмствы? Ад каго яны залежаць? Вось пытаньні, якія стаяць перад намі.

У першую чаргу ўсе кіруючыя органы таварыства павінны спэцыяльна паставіць перад сабой задачу **сур'ёзнага вывучэньня працы ТДА-Авіяхіму сярод сялянства** на тэрыторыі, ахапляемай гэтай арганізацыяй. **Трэба выходзіць з усіх умоў, у якіх жыве і працуе сялянства.** І толькі пасьля гэтага трэба намеціць **канкрэтныя формы і мэтады** працы сярод яго.

Нельга падыходзіць да працы „наогул“. Трэба падыходзіць да працы з сялянствам, ведаючы досыць падрабязна эканоміку райёну, воласьці, вёскі, быт, пляны савецкага будаўніцтва і інш. Бяз гэтага нічога ня выйдзе.

Арганізацыі павінны знайсьці магчымасьці паслаць у вёску працаўніка, які па прыезьдзе на месца можа даць неабходныя ўказаньні, выправіць недахопы, даць параду—што рабіць у тым ці іншым выпадку, з чаго пачаць працу. Трэба, як правіла, паладзіць выкарыстаньне агітпавозак. Тыя арганізацыі, якія арганізуюць іх ужываньне, маюць добрыя вынікі.

Час ужо ў вёсцы пачаць выкарыстоўваць існуючыя там **культурныя** сілы і па лініі ТДА-Авіяхіму. Пры ўсёй нашай беднаце мы ўсё-ж іх маем ня мала. Адно толькі настаўніцтва складае вялізарную армію. Кадры настаўніцтва за апошнія гады палепшыліся ва ўсіх адносінах. Настаўніцтва ўжо мае не малы вопыт у грамадзкай працы.

А загадчык хаты-чытальні, аграном, рабкор, сялькор, валасны жанарганізатар. А дэмабілізаваны чырвонаармеец? А камандзір запасу. Іх усіх шмат. Ёсьць на каго абапірацца, каму кіраваць. Толькі трэба іх арганізаваць. Ініцыятыва ў іх самых маецца. Але не заўсёды яны ведаюць, з чаго пачаць.

Савецкія гаспадаркі, калектыўныя гаспадаркі, розныя каапэрацыйныя аб'яднаньні і іншыя калектыўныя арганізацыі павінны стаць **паказальным пунктам** працы таварыства ў вясковай сапраўднасьці. У іх больш лёгка арганізаваць ячэйку, узмацніць яе, арганізаваць гурток, пабудаваць пір і г. д. Ад іх трэба імкнуцца распаўсюджваць формы і мэтады працы і на неарганізаванае сялянства. У вачох апошняга добрым, найлепшым агітацыйным спосабам павінен зьявіцца **паказ.**

Там, дзе маецца ў вёсцы ячэйка ТДА-Авіяхіму, павінен быць **паказальны вучастак па ўжываньню штучных угнаеньняў**, павінна быць арганізавана сапраўды даючая станоўчыя вынікі барацьба са шкоднікамі сельскай гаспадаркі і рознымі паразітамі хатняга сялянскага быту.

Любая вясковая ячэйка можа шмат чаго зрабіць ва ўсіх гэтых галінах. Да іх яна павінна прыцягваць увагу ўсіх грамадзкіх арганізацый, усяго працоўнага сялянства.

Укараніцца ў вёску, павялічыць колькасьць членаў таварыства, разгарнуць сярод сялянства практычную працу,—вось пастановы пленуму. Іх трэба выканаць.

П. Клевец.

Ваенная праца клюбаў улетку.

Улетку можна значна шырэй разгарнуць ваенную працу, чымся ўзімку. Улетку галоўную ўвагу трэба зьвярнуць на масавае ўцягваньне рабочых і работніц у справу ваеннае навукі. Тактычныя заняткі ў полі, стральба, спаборніцтвы па розных галінах ваеннае справы, экскурсіі ў вайсковыя часьці—вось асноўныя формы масавай ваеннай працы клюбаў улетку.

Тактычныя заняткі лепш усяго сумяшчаць з сьвяточнымі загараднымі экскурсіямі. Пры гэтым тактычныя заняткі не павінны парушаць агульнага характару экскурсіі. Іх ня трэба зацягваць. Найбольш адну гадзіну. Для заняткаў выбіраецца цікавая і навучальная мясцовасьць. Тактычныя задачы і ход заняткаў таксама разьлічваюцца на зацікаўленасьць удзельнікаў. У гэтым выпадку найлепш узяць двухбаковую бойку з невялікімі групамі (рота).

Розныя ваенныя спаборніцтвы тым і добрыя, што яны здольны і зацікавіць рабочых і павялічыць іх ваенныя веды.

Гэткія спаборніцтвы можна арганізоўваць і ў садзе і ў часе загарадных экскурсій.

Улетку асабліва спрыяючыя ўмовы для правядзеньня экскурсій у вайсковыя часьці, як у тыя, што знаходзяцца ў горадзе, так і ў лягерах. Экскурсіі ў лягеры трэба шырока выкарыстаць ня толькі для змычкі з чырвонаармейцамі, але і для пашырэньня ваеннага кругазіду рабочых. Экскурсіі ў тэхнічныя часьці навочна азнаёмяць рабочых з пытаньнямі ваеннай тэхнікі і ўзаемачыннасьці рознага роду войска.

Карысна экскурсіі ў лягеры арганізоўваць у дні, калі вайсковыя часьці праводзяць якую-небудзь паказальную працу: вечар дасканалага стралка, вечар усякага роду войска, сьвята гадавы часьці, вечар абароны, паказальныя тэхнічныя заняткі і г. д.

Асабліва шырока масавая ваенная праца разгортваецца ў перыяд падрыхтоўкі да «Дню абароны», які зьяўляецца аглядам баявой гатоўнасьці працоўных і ўсёй краіны.

Б. Сямкоў.

СКАРЫСТАЕМ ТОРП—НАША ПРЫРОДНАЕ БАГАЦЬЦЕ.

Беларусь мае каля 2.663.020 гэктараў балот*). Паколькі гэтыя балоты не асушаюцца, не скарыстоўваюцца, пастольку яны зьяўляюцца **гаспадарчым ліхам**, непатрэбным зямельным балястам і, дзякуючы сваім прыродным уласьцівасьцям, пагаршаюць умовы жыцьця насельніцтва, робяць мясцовасьці нездаровымі, распаўсюджваючы цяжкую хваробу—**малярыю.**

Апрача таго, балоты не дазваляюць мець добрыя шляхі, таму што пабудова іх у гэтых выпадках абыходзіцца дорага. Пагаршаюць клімат мясцовасьці, выклікаючы раньнія вясенньня і асеньнія замаразкі і робяць яго сырым... І шмат іншага ліха прыносяць балоты.

Але няўжо ня можна мець ад іх ніякай карысьці,—асабліва сялянам земляробам, якія жывуць ублізку балот?

Бязумоўна, можна. Але для гэтага селянін павінен ведаць, што трэба зрабіць з балотам (і як зрабіць), каб мець карысьць.

Шмат сялян у Расеі і Беларусі ўжо ведаюць, што з балота можна здабыць торп для апалу, торп для падсьцілкі жывёле і торп для ўгнаеньня палёў і сенажацяў. Аказваецца, што торп можна з посьпехам ужыць для засыпкі выграбных і памыйных ям і для засыпкі сьцен пры пабудове, а таксама падлогі і столі, каб зрабіць жылыя памяшканьні цёплымі.

А навукай і практыкай ужо ўстаноўлена, што з торпу можна здабываць (як і з дрэва)—тарпяны вугаль, дзёгаць і газу для гарэньня. З гэтага дзёгцю можна здабываць газавае масла, парафін (для сьвечак), крэазот (мэдыцынскія сродкі); а з дзягцярнай вады можна здабываць драўнінны сьпірт, аміяк для ўгнаеньня і воцатную кіслату.

Далей, торп можа ісьці на выраб вінната сьпірту, прычым са 100 клг. (6 з лішнім пудоў) сухога торпу палучаецца $6^1/_2$ вядзёр сьпірту ў 90 градусаў.

Добра торп ужываць там, дзе трэба захаваць прадукт ад замярзаньня (яблыкі, бульба, гародніна), альбо захоўваць ад гнілі такія прадукты, як рыба, мяса, яйкі.

З посьпехам можна ўжываць торп у мэдыцыне, замест ваты, пры перавязках; ён не распаўсюджвае заразы і ўпітвае кроў, якая цячэ з ран, ці гной, які выдзяляецца з балячак і нарываў.

Карыстаюць торп дзеля набіўкі сяннікоў і дзеля вырабу танных тканін і фарбаў.

Самае рознае ўжываньне торпу мы сустракаем у будаўнічай справе: тут ён ужываецца замест моху дзеля пракладкі паміж бярвеньнямі, дзеля закладкі сярэдзіны паміж цагельнымі сьценамі, дзеля вырабу асобнай «тарпяной фанэры», якая патрэбна на пабудову ўнутраных пераборак у жылых будынках і г. д. і г. д.

Адсюль мы бачым, што балоты, як крыніцы дарэмнага прыроднага багацьця—торпу, зьяўляюцца вялікай каштоўнасьцю. Неабходна толькі ведаць, якім чынам скарыстаць балота, як лягчэй здабыць торп і дзе найлепш за ўсё—карысьней і даступней—яго ўжываць.

Спынімся крыху падрабязьней на сельскай гаспадарцы і яе патрэбах і паглядзім, дзе можна ўжыць торп.

Торп, як апал. Торпу дзеля апалу на Беларусі зараз налічваецца да аднаго міліярда тон. Гэта толькі па прыкладнаму падрахунку, а запраўды, пры точным вучоце, яго, зразумела, больш: амаль што каля кожнай вёскі, ва ўсякім выпадку не далей 5—10 вёрст, заўсёды ёсьць балота, якое можна скарыстаць на апал.

Калі мы падлічым запасы ўсіх лясоў Беларусі, дык акажацца, што ў іх драўніны столькі-ж, колькі і торпу ў балотах.

Але лес патрабуе для свайго аднаўленьня 80—100 гадоў пры клапатлівым доглядзе маладых насаджэньняў. І таму трэба лес хаваць, і там, дзе толькі ёсьць магчымасьць яго замяніць чым-небудзь, асабліва торпам,—неабходна імкнуцца да гэтага.

Тады тое, што мы лічым зараз гаспадарчым ліхам, будзе для нас багацьцем. Лес трэба нам для пабудоў, для розных вырабаў у гаспадарцы, і лес патрабен нам як каштоўны матар'ял для гандлю з заграніцай.

Здабываньне торпу нескладанае, не патрабуе амаль ніякіх грашовых затрат, а толькі працы.

Ён гарыць таксама добра ў звычайных печах, як і дровы, а часта дае цяпла нават больш, чым дровы.

Торп, як падсьцілка для жывёлы. Жывёла ў сялянскай гаспадарцы ўтрымоўваецца рэдка па правілах, якія ўказвае навука. У селяніна, пры нізкіх ураджаях збожжа, палучаецца мала саломы. А калі салома і ёсьць, дык яна ідзе на корм жывёле, бо пры нястачы сенажацяў заўсёды бывае мала корму.

Жывёла стаіць на голай зямлі, або на голай падлозе—звычайнае зьявішча ў сялянскай гаспадарцы, і таму яна брудная, запэцканая ў гнаі.

Тут на дапамогу прыходзяць тыя-ж **балоты, той-жа торп.**

Аказваецца, што торп зьяўляецца самай лепшай падсьцілкай для жывёлы і вот чаму: ён дае цёплы подсьціл жывёле, ён утрымлівае жыдкія нячыстоты, каштоўныя для ўгнаеньня палёў, пагэтаму пры ўжываньні торпу падлога скотных двароў заўсёды сухая.

Балот у нас шмат і яны блізка. Будзем-жа **клапаціцца аб здароўі жывёлы і пяройдзем да ўжываньня ў гаспадарцы тарпяной падсьцілкі.** Гэтым мы з'эканомім салому для корму і атрымаем больш гною, прытым гною больш каштоўнага і вельмі патрэбнага нашай поснай глебе і сенажацям.

Торп, як угнаеньне. Ураджаі палёў Беларусі надта нізкія.

Гэтыя нізкія ўраджаі тлумачацца тым, што глеба спусьцела, у ёй няма страны для расьлін.

Дзеля таго, каб падтрымліваць глебу ўрадлівай, трэба пры трохпольлі даваць ёй штогод па 2.400 п. гною на дзес., а мы даём усяго 400—800 пуд.

Але гною ў гаспадарцы не хапае: няма корму, і жывёлы трымаюць у гаспадарцы мала.

І тут да нас на выручку прыходзе торп.

Торп ствараецца з адмёршых расьлін, утрымоўвае ў сябе ўсе тыя матар'ялы, якія неабходны для кармленьня расьлін. Трэба толькі, каб расьліны, з якіх складаецца торп, перагнілі, пачарнелі. Тады торп будзе надта добрым для ўгнаеньня.

Торп, які неабходна здабыць з восені, альбо ўзімку, складываюць у кучы каля поля, якое патрэбна ўгнаіць. Некалькі разоў яго ў кучах перакапываюць, каб ён больш праветрыўся, і к восені на папары яго можна карыстаць, як угнаеньне, замест гною.

Лепш, калі гэты торп з балота вывезьці ўзімку к сабе на двор у кучу і пасыпаць яго вапнай, а затым усе адброскі хатняй гаспадаркі—попел з печаў, памыі, шуму з хаты, птушыны памёт і інш. выкідываць на гэту кучу. Часамі неабходна і ў гэтым выпадку кучу таксама перакапываць, і тады к восені, або к вясне будучага году—к сяўбе ярыны, у гаспадарцы будзе ўгнаеньне, па якасьці ня горшае за гной.

Яшчэ лепей, калі к тарпяной кучы дадаць гною з кароўнікаў і канюшняў. Тады торп у кучы робіцца яшчэ лепшым за гной. Такім чынам, запамятаем наступнае: **балота—гэта наша носка ыстанае дармовае багацьце** Клапатлівы і беражлівы селянін павінен карыстаць у гаспадарцы торп—як апал, як падсьцілку замест саломы, як угнаеньне. Тады ўраджаі сельска-гаспадарчых расьлін павысяцца, гаспадарка земляроба ўзмацніцца, а ад гэтага палепшыцца і народная гаспадарка рэспублікі.

Больш увагі торпу! Больш клопату аб нашых лясох, нашай жывёле і нашых палёх!

Беражэце балоты ад пажараў. Імкнецеся ўжываць торп у гаспадарцы ўсюды, дзе ён зьяўляецца падыходзячым матар'ялам!

Скарыстоўвайце дармавое багацьце прыроды—торп, запасаў якога хопіць на тысячы гадоў.

Х. Бахцееў.

*) Па даных вуч. сэкратара Тэхн. Камітэту інж. С. П. Міхайлава.

Барацьба са шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы.

ШТО Ў ГЭТЫМ МОЖА ДАПАМАГЧЫ АВІЯХІМ.

Мы прызвычаены лічыць, што колькасьць прадуктаў, атрыманых у нашай сельскай гаспадарцы, залежыць ад засеўнай плошчы, ад апрацоўкі і ўгнаеньня глебы, ад якасьці насеньня, колькасьці асадкаў і інш. Але мы рэдка ўспамінаем, што наш ураджай залежыць таксама і ад таго, у якой меры мы ахоўваем яго ад розных шкоднікаў.

Па даных дасьледваньняў шкоднікі і хваробы расьлінны нішчаць штогод на мілярд і больш рублёў розных сельска-гаспадарчых прадуктаў. У адносіне да ўсяго вялікага прыбытку ад сельскай гаспадаркі ў 1927-28 г. гэта складае, прыблізна, 9-19 проц. Іншымі словамі, з нашага ўраджаю мы штогод аддаём сусьлікам, саранчы, даўганосікам і іншым шкоднікам каля 10 проц.

Нават у тых выпадках, калі няма стыхійнага налёту таго ці іншага шкодніка, страта мала зьмяншаецца. Тлумачыцца гэта тым, што амаль кожнае поле, сад, гарод, ці пуня, заражаны шкоднікамі ці хваробамі, якіх часта мы нават не заўважаем.

Барацьба са шкоднікамі і хваробамі расьлін вельмі марудная і вымагае шмат сродкаў. Аднак, вынікі гэтай барацьбы поўнасьцю варочаюць і патрачаную працу і грошы. Зьнішчэньне шкоднікаў або папярэджаньне, або лячэньне хвароб расьлін праводзіцца ў розныя месяцы ў залежнасьці ад часу іх зьяўленьня. Раньняю вясною перад засевам робяцца захады да папярэджаньня заражэньня насеньня ад галаўні. Крыху пазьней пачынаецца барацьба з сусьлікамі і мышамі. У канцы лета робяцца захады да папярэджаньня заражэньня сьвірнаў і інш.

Скажам, як забясьпечыць насеньне ад заражэньня галаўнёй. Звычайна, каб забясьпечыць насеньне ад заражэньня, яго пратручваюць і прамываюць фармалінам. (Пратручван не фармалінам забясьпечвае ад усіх відаў галаўні, апроч пыльнай галаўні пшаніцы і ячменю). Раствор фармаліну робіцца такім чынам: наліваецца ў бочку адна бутэлька фармаліну на 15 вёдраў вады. У раствор апускаюцца мяшкі з адным ці адным з палов. пудам зярна. Насеньне трымаецца ў растворы фармаліна 3-5 хвілін для таго, каб фармалін намачыў усё зярно. Пасьля гэтага мяшкі вымаюць і зярно рассыпаюць на падлогу ці на брэзэнт. Зьверху зярно прыкрываецца брэзэнтам ці мяшкамі. Праз 2 гадзіны зярно ўжо пратручана, яго сушаць, пасьля чаго яно гатова да севу. У выпадку, калі зярна для пратручаньня шмат, праца вядзецца інакш: зярно рассыпаюць на падлозе ці на брэзэнце пластом каля 30-35 см. (поўарш.) і патроху паліваюць з лейкі з сеткаю растворам фармаліну. Пры гэтым трэба, каб усё зярно было змочана, зрабілася вільготным.

Адной бутэлькі фармаліну хопіць для пратручаньня 40-50 пудоў насеньня. Пры існуючай цане на фармалін гэта можа каштаваць прыблізна 1 рубель. Пратручваньне фармалінам замяняе часамі пратручваньне медным купа осам, якога бярэцца 62 грамы на 12 літраў вады (ці 1 з палов. фунты на 10 вёдраў вады). Насеньне ў мяшках апускаюць у бочкі з растворам на 5 хвілін, пасьля чаго яго сушаць. Пратручваньне звычайна робіцца незадоўга да пасеву.

Пратручваньне фармалінам зусім простая справа і даступна для кожнага селяніна.

Застральшчыкамі ў гэтай барацьбе павінны быць ячэйкі ТДА-Авіяхіму. Яны павінны арганізоўваць сялян для барацьбы са шкоднікамі, паказваць, як трэба іх зьнішчаць, быць заўсёды напагатове для папярэджаньня стыхійнага налёту шкоднікаў. Для гэтага ячэйкі ТДА-Авіяхіму павінны самі вывучыць, якія асноўныя шкоднікі маюцца ў іхных райёнах, якія хімічныя прадукты ўжываюцца для барацьбы з імі. Мэтазгодна ўстанавіць сувязь з мясцовымі агранамамі для атрыманьня ад іх указаньняў і інструкцый па папярэджаньню заражэньня палёў, садоў, гародаў і сьвірнаў ад шкоднікаў.

Барацьба са шкоднікамі і хваробамі расьлін пры дапамозе хімічных сродкаў для большасьці нашага сялянства зьяўляецца справай новай. Пры дапамозе ячэек ТДА-Авіяхіму яна павінна ў бліжэйшыя гады шырока разгарнуцца.

С. Ваньковіч.

КРАЯЗНАЎЧАЯ ПРАЦА Ў МЕНШЧЫНЕ.

(Да агульнагарадзкой краязнаўчай канфэрэнцыі).

На 22 красавіка ў гор. Менску склікаецца агульнагарадзкая краязнаўчая канфэрэнцыя, з удзелам асветнікаў гораду, студэнцтва і інш. культурных працаўнікоў. На канфэрэнцыі будуць абмеркаваны пытаньні аб пашырэньні краязнаўчае працы ў горадзе і райёнах і практычныя мерапрыёмствы на лэтні час. Зараз, калі мы ўступім ў паласу культурнае раваюцыі, краязнаўства набывае асабліва вялікае значэньне. Краязнаўчай работы як ў горадзе, так і ў акрузе шмат, і яе вядуць школы і паасобныя таварышы, але-ж неяк раскідана.

Недастаткова ўдзельнічаюць у гэтай справе асьветнікі, ня кажучы ўжо аб іншых культурных працаўнікох, як аграномы, дактары і г. д.; слаба зацікаўлены прафарганізацыі, камсамольскія ды іншыя грамадзкія арганізацыі.

Адгэтуль ясна, што чарговай нашай задачай зьяўляецца ўзмацніць краязнаўчую работу і пашырыць яе, прыдаўшы сталы плянавы характар, прыцягнуўшы да гэтае справы шырокія масы працоўных, аграномаў, дактароў, прафсаюзныя і грамадзкія арганізацыі.

М. С-к.

ЦІ БУДЗЕ ПАБУДОВАНА СЁЛЕТА ЦЭНТРАЛЬНАЯ МАЛОЧНАЯ.

Летась увосень пампезна адсьвяткавалі закладзіны Цэнтральнай Малочнай у Менску.

Бязумоўна, былі тут палкія прамовы аб значэньні пастэрызаванага малака і інш. прыгожых рэчах.

Вось падышла ўжо вясна, усюды рыхтуюцца да будаўніцтва, а Менсельпром, які будзе кіраваць пабудоўкай малочнай, нешта марудзіць. Яно і зразумела: ён толькі нядаўна расчухаўся і пачаў складаць свае праэкты. Калі дадаць да гэтага, што плян будзе яшчэ разглядацца ў вышэйшых інстанцыях, то стане ясным, што з будаўніцтвам малочнай напэўна спозьняцца.

А ці ня можна паварушыць як-небудзь гэтую справу?

нас павінны быць больш шырокімі, больш магутнымі. Вопыт праробленай працы гаворыць за гэта.

III.

Калі супрацоўнік аднэй з менскіх газэт зайшоў у Наркамзем і папрасіў даць яму матар'ял аб мэліярацыі калектыўнага фонду «Мар'іна», дык адзін з спэцыялістаў адказаў: «А мо' гэта будзе матар'ял, кампрамэтуючы нас?».

Дзіўны факт. Там, дзе трэба папулярызаваць, пісаць, больш шырока інфармаваць усю Савецкую Беларусь, там людзі хочуць хаваць пад спудам матар'ялы аб сваёй працы, баючыся лейкай кампрамэтацыі.

Беларускае дзяржаўнае выдавецтва далёка стаіць ад мэліярацыйнае працы, але і яно, як відаць, хварэе на боязьнь наркамзэмаўскага спэцыялізма. Мы да гэтага часу ня маем належнага ліку масавай сялянскай літаратуры пра мэліярацыю, пра яе неабходнасьць, карысьць, значэньне. У навуковых «тоўстых» часопісях можна найсьці шмат каштоўных артыкулаў пакоп асушваньня балот. Але гэта артыкулы для вучоных спэцыялістаў. Сялянству-ж, якое ў першую чаргу павінна быць зацікаўлена і ўцягн та ў мэліярацыйную працу, мы ніякай літаратуры не далі.

У нас пад Менскам ёсьць найлепшая балотная станцыя. Там навука твор ыць цуды. Аб гэтай станцыі ведаюць ня толькі навуковыя колы Саюзу, але і Эўропа.

А беларускае сялянства?

Яно прымушана здавольвацца сухімі артыкуламі, якія часам зьмяшчаюцца ў газэтах, эпізадычнымі наведваньнямі гэтай станцыі (пераважна сяляне Менскай акругі), але да гэтага часу ня мае кніжкі, якая дакладна і выразна растлумачыла-б, чаго можна дасягнуць на балоце, выкарыстаўшы навуковыя вопыты і веды.

Белгоскіно выпушчае хутка фільм «У вялікім горадзе» (інакш кажучы «Масква кабацкая»). А вось паклапаціцца, каб выпусьціць фільм на тэму аб «вялікіх балотах», аб тым, што з гэтых балот можна ажывіць квітнючую зямлю, аб тым, як асушваньне балот навучае сялянства калектывізацыі,—аб гэтым няма часу падумаць Белгоскіно. Кіраўнікі яго адкажуць, што няма сцэнарыя. Але калі знайшоўся чалавек, здольны напісаць сцэнары для фільму «Бой зуброў», дык чаму Белгоскіно ня хоча пашукаць чалавека, здольнага напісаць сцэнары аб балоце. І калі людзі выпушчаюць істужку для барацьбы з прастытуцыяй, заяўляючы, што істужка дапамагае ліквідаваць гэтае няшчасьце, дык гэта ня значыць, што балота меншае няшчасьце і з ім можна пачакаць. І, нарэшце, няўжо сцэнарыі пішуць

МАЕ ПРЫГОДЫ.

З ЦЭРАБКОПАЎСКІХ КУР'ЁЗАЎ.

Вядома, які смак атрымаць пстрычку ў нос. Вядома, бо, ма'быць, кожны ў дзяцінстве атрымаў яе ад якога-небудзь свайго сябра: Косьціка: Пецькі ці Грышкі.

Дзяцінства—адна справа, а дарасласьць—другая. Тады, пстрычка—ня пстрычка, а вось цяпер, калі атрымаеш яе ў стары, цьвёрды нос—дрэнна.

Мае прыгоды, у часе якіх я пачаў атрымліваць пстрычкі ад ЦРК—свае роднае арганізацыі—(атрымаць пстрычку ад свайго горш, чымся ад чужога) пачаліся з таго, калі падраўся аколыш у маёй ямчэ шлюбнай шапцы.

— Дайце кепку,—кажу, зайшоўшы ў магазын гатовага адзеньня (пад «Миншвеем»).

— Калі ласка,—адказваюць.—Гэта 3 р., гэта—3 р. 50 к., а гэта—4 р. 50 к.

Не падабраўшы разьмеру, я пашоў, заручыўшыся абяцанкай прыказчыцы, што праз тыдзень будуць патрэбныя мне разьмеры.

Прайшоў тыдзень—няма. Прайшло два—няма. Тры—няма. А аколыш распаўзеўся дарэшты.

— Няма, кажуць, і ня будзе, бо мы шыем кепкі толькі тых разьмераў, якія штодня купляюцца тысячамі. Ваш разьмер у дзень разыдзецца ня больш, як 100-150.

Забалеў нос, але рабіць ня было чаго. Пашоў да прыватніка і купіў кепку, хоць і горшую, як у ЦРК, і заплаціў 6 р.

* * *

Паліто, якое падарыў мне десьць, пранасіўшы яго 25 год, пачало ад вясьняннага дажджу распаўзацца.

— Эх, думаю, так доўга чакаў, што цяпер трэба добрае паліто купіць. Не хачу бобрыка стрыжанага, даеш драпавае.

Трэба паліто, трэба і гарнітур. Вазьму, думаю, крэдыт, бо заплаціць адразу няма грошай

Пашоў у той-жа магазын.

— Як, пытаюся, узяць крэдыт?

— Асыгноўку ад установы, дзе працуеш, або вэксаль яе.

Вось дык крэдыт думаю. Нават вэксаль на мяне і то павінна даць установа, а ня я. Значыць я нішто, нуль для ЦРК. А я думаў будзе так, як летась было з прыватнікам: пашоў, напісаў яму на 180 рублёў вэксалёў за мэблю, праз 4 месяцы выплаціў і квіта.

Наконт асыгноўкі ўстанова мне сказала так: што мелі даваць асыгноўку ЦРК, дык лепей—на яе табе і пайдзі купі за гатоўку.

Грошы ў кішэні. Я ў магазыне гатовага адзеньня ЦРК. Замест добрага паліто я купіў гумовы макінтош, бо..., бачыце, усе драпавыя паліто ЦРК «пашыты не на мой разьмер».

Баліць храсток у носе, але лезу, дабіваюся свайго.

— Пакажыце мне добры гарнітур.

— Добрага няма. Вазьміце вось гэты за 37 руб.

— Пакажыце мне вунь той, што ўнізе на апошняй полцы.

— Гэта не на ваш разьмер.

Адышоў у бок, стаю. Сачу за прыказчыкам.

Падыходзіць нейкі грамадзянін і просіць гарнітур. Прыказчык паказаў. Колер гарнітуру здалёк мае вельмі спадабаўся. Я падышоў і ўбачыў, што гарнітур такі, які мне патрабен: сьветлы, з Ленінградзкага сукна, добры.

— Выпішыце мне гэты гарнітур.

— Нельга. Ён не прадаецца.

— Чаму?

— Гэта гарнітур загадчыка магазыну(?).

Храсток у носе ад пстрычкі баліць, а я іду да прыватніка.

Хоць ён і ня свой чалавек, але ў яго нешк зручней. Прыме пябе, як чалавека, возьме з цябе, што захоча, але і дасьць тое, што хочаш.

Усё і на ўсе разьмеры ёсьць, толькі бяры.

* * *

Вывады? Яны самы напрашваюцца. Калі праўленьне ЦРК так сьлепа даверае свайму загадчыку магазыну і яго прыказчыку, не парушіцца паказаць ім выхадныя дзьверы, дык за справу павінны ўзяцца іншыя органы.

У рабочай каапэрацыі ня месца спэкулянтам і „дельцам", якія прадаюць добрыя матар'ялы толькі „сваім людзішкам". Гэтыя „дельцы" рабуюць народнае даброе і паганяць слова—каапэрацыя.

Пайшчык.

БІБЛІАГРАФІЯ.

Н. Рубакін. Што такое падземны агонь. Выданьне Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва. Менск, 1928 г. Стар. 120. Цана 80 кап.

Кніжка т. Рубакіна прысьвечана пытаньням фармаваньня зямнае кары: паступовага астуджаньня гарачай кіпучай лавы і ператварэньня яе ў цьвёрдую земляную масу.

Шырокія колы грамадзянства вельмі слаба азнаёмлены з навукова-пабудаванымі тэорыямі аб фармаваньні нашай зямлі, аб тым, што ўнутры зямлі і цяпер яшчэ тэмпэратура вельмі гарачая, што выбухі вулканаў і землятрасеньні зьяўляюцца вынікам накапленьня ў асяродку зямлі масы газаў, што пад паверхняю зямлі ёсьць падземныя рэчкі і вазёры і г. д.

Тав. Рубакін пачынае сваю кніжку з апісаньняў на тэмы: як часамі з дна мора падымаюцца выспы; што такое вулкан; выспы, якія зьнікаюць; гарачая выспа на халодным моры і г. д.

У другім аддзеле гаворыцца аб вулканах у Эўропе і іх выбухах: падрабязна апісаны выбухі вулканаў Вэзувія і Этны; далей апісваецца вулкан-маяк Страмболі.

У трэцім аддзеле апісваюцца вялікія выбуховыя горы Азіі: гара Арарат, вулканы Ракатоу і Тамборо.

У чацьвертым і пятым аддзелах апісваюцца вулканы Ісьляндыі і вакол Вялікага Акіяну. У 6-м, 7-м, 8-м і 9-м аддзелах аўтар закранае такія тэмы: аб чым гаворыць вулканы; ці ўсюды пад зямлёю стаіць такая гарачыня; гарачыня ў капальнях; артэзыянскія калодзежы; гарачая вада з-пад зямлі; агнёвае мора; што такое вада; распаленыя нябесныя сьвяцілы; агнёвыя вазёры на высьце Гавай і ці можна прыкмеціць, як халадзее зямля; што робіцца з зямлёю, калі выходзіць пяцло; ці праўда, што сьціснулася ядро зямлі; што будзе праз мільёны гадоў.

Як бачым, аўтар дае шэраг цікавых апісаньняў і тлумачэньняў да іх, якія нас навінны тым больш цікавіць, што мінулым летам і восьнёю землятрасеньні адчуваліся і ў СССР. Але нават і без гэтага кніжка т. Рубакіна, напісаная зразумелай для шырокага чытача мовай, дае магчымасьць кожнаму больш менш граматнаму чытачу даведацца аб цікавых і для шматкаго зусім невядомых рэчах з гісторыі нашай плянеты. І па цане кніжка (120 старонак) даступна для амаль ня кожнага—каштуе 80 кап. У кніжцы шмат малюнкаў на пералічаныя вышэй тэмы. П. Т.

В. СТАШЭЎСКІ. У ПРОШЧЫ. АДНААКТАВЫ АБРАЗОК. БДВ—Менск—1928 г. у ліку 2.000 экз. 32 стар. Цана 22 кап.

Аднаактавы абразок В. Сташэўскага «У прошчы» адбівае і бытавога боку паводзіны сялян, дзяўчат і хлапцоў, прыехаўшых на фэст, у прошчу. Сама прошча ў абразку недзе з боку,—дзеі адбываецца ў ляску. В. Сташэўскі ў п'есы паказвае, як камічна выглядае са сцэны жаданьне Макарончыка—заможнага фальваркоўца сасватаць паштовану работніку Грэчцы сваю старую дачку Веру...

Як камэдыйны твор, абразок заслугоўвае ўвагі. В. Сташэўскі ўладае поўнай долай гумару, шчырага, з жыцьця...

Добра дадзены ролі Хвальбопкага і Шмыгельскага. Добра пададзены тып гандляра Моткі (—Ой, ой, цяперашні гандаль ды яшчэ без патэнту, дык адзін страх...).

Праз усю п'есу пранізаны камічныя сцэнкі, хоць мясцамі грубаватыя... (сцэнка з хваробаю жывата Шмыгельскага).

Beta.

НОВЫЯ КНІГІ:

Вышлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кнігі:

1. «На литературном посту» № 7 за 1928 г. Стар. 96, цана 50 кап. Дзяржаўнага Выдавецтва, Масква.
2. «Красная печать» № 6 за 1928 г. Стар. 64, цана 50 кап. Двухтыднёвы орган Аддзел Друку ЦК ВКП(б) Масква.

ХРОНІКА.

Праезд праз Менск дзяцей баўгарскіх рабочых.

Учора позна ўвечары хуткім цягніком з Негарэлага праз Менск праехалі 20 хворых дзяцей баўгарскіх рабочых. Гэтыя дзеці накіроўваюцца ў Крым для лячэньня.

У Негарэлым дзеці былі спатканы прадстаўнікамі Беларускага Чырвонага Крыжу т. т. Кузьмінскім і Мышкоўскай, якія апекаваліся дзецьмі, арганізавалі для іх харчаваньне і інш.

Дзецям на далёкае падарожжа Чырвоны Крыж выдаў некалькі аптэчак і пакетаў.

У ЦС ОСО-Авіяхіму БССР.

Перавыбары органаў ОСО-Авіяхіму.

Перавыбарная кампанія ячэек, раённых і акруговых саветаў ОСО-Авіяхіму па БССР скончылася. Усебеларускі зьезд ОСО-Авіяхіму адбуд ецца ў маі. У зьезьдзе прымуць удзел 70 дэлегатаў.

Закладка паказальных вучасткаў.

Менскі акруговы савет ОСО-Авіяхіму адпусьціў 200 р. на закупку мінэральных угнаеньняў для закладкі паказальных вучасткаў. Гэтыя вучасткі будуць закладзены ва ўсіх раёнах (па 1-2) у найбольш актыўных сяброў ОСО-Авіяхіму.

17.000 бядняцкіх гаспадарак будзе каапэравана ў малочныя арцелі.

Белсельсаюз мяркуе да 1 кастрычніка бягучага году каапэраваць у малочныя арцелі 17 тысяч бядняцкіх гаспадарак. У існуючых арцелях да канца году колькасьць сяброў у сярэднім будзе даведзена да 200 чалавек, а ў тых, якія будуць арганізаваны сёлета,—да 100 чал.

Да першага кастрычніка мяркуецца 40 малочных арцеляў пераведзьці на жаночае сяброўства. Райён дзейнасьці малочнай арцелі ўстаноўлены ў 10-15 вёрст.

Парадак выдачы зарплаты да 1-га Мая.

Наркампрацы пастанавіў зарплату да сьвята 1-га Мая выдаць раней устаноўленых тэрмінаў: на прадпрыёмствах, па дагаворанасьці саюзаў з адміністрацыяй, не пазьней 28 красавіка будуць выдадзены аванты ў разьмерах 50 проц. 2-хтыднёвай зарплаты; у бюджэтных установах 28 красавіка будзе выплачана поўнасьцю зарплата за другую палову красавіка; установы, якія знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку, павінны будуць выплаціць зарплату поўнасьцю не пазьней 26-27 красавіка; у раённых і сельскіх мясцовасьцях зарплата за красавік павінна быць выплачана поўнасьцю не пазьней 28 красавіка.

Фабрыка гнутай мэблі.

З прычыны тато, што на рынках ёсьць вялікі попыт на гнутую мэблю і што да гэтага часу ў БССР выраб гнутай мэблі быў вельмі слабы, ВСНГБ парушыў пытаньне ад арганізацыі гэтай вытворчасьці пры дрэваапрацоўчай фабрыцы ў Бабруйску. Сыравіны для вытворчасьці гнутай мэблі—лясковых палак—у Беларусі хапае.

Нядзельны унівэрсытэт для рабочай моладзі.

У Менску з наступнага навучальнага году арганізуецца нядзельны унівэрсытэт для рабочай моладзі. Унівэрсытэт будзе мець 2 цыклі: прыродазнаўча-тэхнічны і грамадзка-эканамічны. У гэты унівэрсытэт будзе прынята 200 чал. па 100 чал. на кожны цыкль. Выкладчыкамі у унівэрсытэце будуць навуковыя працаўнікі БДУ і інжынэры.

Дзяржстрой ужо прыступіў да будаўнічых работ.

Дзяржстрой ужо прыступіў да будаўніцтва. Ужо адбываецца кладка фундаманту каменнага 3-хаверхавага будынку на 12 кватэр, які прызначаецца для камандзнага складу. Таксама пачата работа па пашырэньні заводу Цэнтрасьпірту па вул. 2-й Лекерта. Прыступлена да капаньня катлавіны пад дом на 70 кватэр (рог вуліц Камсамольскай і Унівэрсытэцкай). Матар'ялы для пабудовы гэтых будынкаў ужо падрыхтаваны.

КАЛІ АДБУДУЦЦА ЗЬЕЗДЫ КАЛГАСАЎ.

Вырашана акруговыя зьезды калгасаў правесьці пасьля Ўсесаюзнага зьезду, прыблізна ў палове чэрвеня. Усебеларускі зьезд калгасаў адбудзецца ў верасьні бягучага году. На Ўсебеларускі зьезд прыедзе 60 дэлегатаў з усіх округ БССР.

ПЕРАПАДРЫХТОЎКА ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫХ НАСТАЎНІКАЎ.

Нар. Кам. Асьветы пастанавіў арганізаваць у часе летняга перапынку вышэйшыя курсы для падвышэньня кваліфікацыі інжынэрна-тэхнічнага складу настаўнікаў, якія выкладаюць спэцыяльныя прадметы ў індустрыяльных тэхнікумах і прафшколах павышанага тыпу. Курсы будуць арганізаваны пры Віцебскім політэхнікуме, куды будуць спэцыяльна запрошаны прафэсары з Ленінградзкага Тэхналёгічнага Інстытуту. На курсы будзе прынята 20 чал.

ДАШКОЛЬНЫЯ ПЛЯЦОЎКІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ.

Сёлета ў Менску будзе адчынена для дзяцей членаў прафсаюзаў, саматужнікаў і неарганізаваных беднаты звыш 40 дашкольных дзіцячых пляцовак.

ІМПОРТНЫЯ КОСЫ.

Белсельсаюз заказаў у Аўстрыі партыю кос у колькасьці 30000 штук, з якіх ужо атрымана каля 18000 штук. Косы будуць разьмеркаваны паміж сел.-гасп. каапэрацыяй БССР для задавальненьня сялянскіх гаспадарак.

АБ ЖЫЛІШЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ НА ЗАВОДАХ ШКЛОТРЭСТУ.

Эканамічная Нарада прызнала неабходным прыступіць у бягучым будаўнічым сезоне да пабудоўкі пры заводах шклотрэсту жыліш для рабочых плошчаю да 18 тыс. кв. мэтр. і запрапанавала ВСНГ БССР вылучыць на першачарговае будаўніцтва 150 тыс. руб.

СУД.

ПРЫГАТАВАНЬНЕ БРАГІ ПАВІННА КАРАЦЦА, ЯК САМАГОН.

(На пленуме Вярхоўнага Суду).

Зараз, калі вядзецца барацьба з самагонакурэньнем, на практыцы ўзьнікла прынцыповае пытаньне, сутнасьць якога ў наступным:

У хаце аднаго грамадзяніна (селяніна) міліцыянэр знайшоў у бочцы каля трох вёдзер брагі. Быў складзен пратакол, які міліцыя накіравала Нарсьледчаму ў парадку п. 3 арт. 105 КПК. Нарсьледчы накіраваў справу ў Нарсуд з пастановай аб прыцягненьні вінаватага да адказнасьці па 140-б арт. КК.

Нарсуд прызнаў грамадзяніна вінаватым у вытвораньні самагону і прыгаварыў яго да пазбаўленьня волі на год і 2 месяцы.

Пры рэвізіі нарсуду гэта кваліфікацыя была зафіксавана ў акце, як няправільная. Па думцы асоб, рэвізаваўшых Нарсуд, у данным выпадку было толькі прыгатаваньне да вытвораньня самагону, якое, згодна 12 арт. К. К., ня мае ў сабе складу злачынства.

На пленуме Акруговага Суду, дзе абгаварваўся памянёны акт рэвізіі, гэта пытаньне ня мела аднагалоснага вырашэньня, чаму яно было ўнесена ў Пленум Вярхоўнага Суду, які 5 красавіка г. г. разьясьніў, што згодна арт. 11 асноўных падстаў Крымінальнага Закон даўства Саюзу ССР і саюзных рэспублік, якія дзейнічаюць і на тэрыторыі БССР з 1924 г., прыгатаваньне да злачынства і замах на яго не разьмяжоўваюцца паміж сабою і караюцца таксама, як і ўчынёнае злачынства, але мера сацыяльнай абароны дапасоўваецца ў залежнасьці ад ступені небясьпекі асобы і ступені ажыцьцяўленьня злачыннага намеру

Значыць, прыгатаваньне брагі для самагону трэба разглядаць, як выганку самагону.

К. Б.

25 бяспрытульных дзяцей на вытворчасьць.

Да сьвята 1 Мая прыўрочваецца выпуск з дзіцячых дамоў 25 бяспрытульных, якія будуць накіраваны на вытворчасьць у працкалектывы і на фабрыку «Миншвей». Маецца таксама на ўвазе накіроўваць на грамадзкія работы дзяцей дэкласаванае беднаты.

Выгавар за нядбайныя адносіны да абавязкаў.

Прэзыдыум Менскага АВК абвесьціў выгавар старшыні Самахвал ўскага РВК тав. Сьляпанаву за нядбайныя адносіны да рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

Аб працы 30 красавіка.

Наркампрацы даў указаньні аб тым, што рабочым фабрык і заводаў, якія працавалі 16 красавіка, дазваляецца гэты дзень замяніць на 30 красавіка.

Для служачых, праца якіх ня зьвязана непасрэдна з прадпрыёмствам, 30 красавіка зьяўляецца рабочым днём. Служачыя ўстаноў, якія па дабраахвотнай згодзе з адміністрацыяй працавалі 16 красавіка, узамен гэтага могуць дадаткова да чарговага адпачынку атрымаць яшчэ адзін дзень.

Арганізацыя вырабу капылоў.

Да гэтага часу капылы (для вырабу абутку) вырабляліся ў Барысаве некаторымі саматужнікамі. Гэты выраб быў нагатулькі малы, што дзёка не здавальняў попыту ня толькі РСФСР, але і Беларусі. Прамплян ВСНГБ пастанавіў арганізаваць фабрычную вытворчасьць капылоў пры адным з гомельскіх дрэваапрацоўчых заводаў. Для вырабу капылоў патрабен выключна граб, і гэты гатунак дрэва ў Гомельшчыне расьце ў вялікай колькасьці.

Рознае.

СПРАВА, ЯКАЯ ЦЯГНЕЦЦА КАЛЯ 1000 ГАДОЎ.

Грамадзянскі трыбунал гораду Нэапалю (Італія) зарав разглядае справу, якая цягнецца з 1.002 году. Напярэдадні 1.000-га году па зямлі пайшлі чуткі аб канчыне сьвету. У 999-м годзе сяляне, гаспадары вялікага вучастку зямлі з лясамі і сенажацямі, аддалі ўсю гэту маемасьць манастыру сьвятога Трыфона. Праз тры гады, пераканаўшыся ў трываласьці зямной кулі, сяляне патрабавалі свой дар назад, але манахі не аддалі. З тых часоў працэс паміж вобшчынай Раппало, якой належыў гэты вучастак зямлі, і манастыром слухаўся ў судох некалькі сот разоў і, бязумоўна, ні разу ня даў пажаданых вынікаў для сялян.

18 МІЛІЯРДАЎ ПАШТОВЫХ МАРАК ЗА ГОД.

У Амэрыцы вылічылі, што ў сёлетнім годзе на ўсім сьвеце панадабіцца каля 18 міліярдаў паштовых марак. Калі-б усе гэтыя маркі пакласьці адну за другой, дык яны мелі-б даўжыню ў 375.000 вёрст, г. зн., яны ахапілі-б кругом усю зямную кулю 10 разоў. А каб скласьці іх адна на адну, дык вышаў бы слуп вышынёй каля 2.000 вёрст.

ЧЫМ ХВАРЭЛІ НАШЫ ПРОДКІ.

Прафэсар Сак, які вывучыў звыш 30.000 эгіпецкіх мумій, сьцьвярджае, што адзінай хваробай страдаўніх людзей былі раны, набытыя ў баёх. Рост культуры прынёс рост хваробаў. Хвароба почак узьнікла прыблізна 3-3 з паловай тысячы гадоў таму назад, тубэркулёз прыкмецілі яшчэ пазьней. У эгіпецкіх мумій няма аніякіх адзнакаў вэнэрычных хваробаў і праказы. Зубныя хваробы ўзьніклі спачатку ў палацах фараонаў ад далікатнай стравы.

351 ЯЙЦО ЗА ГОД.

Унівэрсытэцкая фэрма ў Канадзе ма курыпу гатунку легторы, якая зьнесла 35 яйцо за год. Ад продажу гэтых яек ун вэрсытэт зарабіў 2.900 даляраў. За ... гэтай курыцы бярэць плату ў 10 даляраў Гэта курыца—самая дарагая на сьвеце Яна застрахавана ў 20.000 даляраў.

МАШЫНКА-АЎТАМАТ.

Амэрыканскі вынаходца Томас Морысо надумаў пішучую машыну-аўтамат, яка мае злучэньне з тэлефонам. Машынка са ма друкуе ўсе словы, якія кажуць у тэле фонную трубку. Устройства гэтай ориг нальнай выраходкі пакуль што хаваецца сакрэце.

БЕЗАПАСНАЯ ЛОДКА.

Шуттэвэрская судабудаўнічая вэрфь Роттэрдаме (Галяндыя) сканструіравала лодку дзеля паратункаў у часе нячасты выпадкаў. Лодка сканструіравана так, ... яна ня можа ні патануць, ні нават перак ліцца пры самай страшнай навалніцы.

Каб даказаць якасьць лодкі, капітан Сьміт выехаў на ёй у Нью-Ёрк. Свае па дарожжа ён мяркуе зрабіць за 40 дзён Апрача капітана, у лодцы ёсьць штурман і радыётэлеграфіст.

У даўжыню лодка мае ўсяго 7 з паловай мэтры і ў шырыню—2,2 мэтра.

ЛЁТ НА ПАЎНОЧНАЕ КАНЦА-ВОСЬСЕ.

Дырыжабль ген. Нобіле „Італія", як ляціць на паўночнае канцавосьсе, над дзьвёх гадзін лятаў над Глівіцамі ў Польшчы і потым апусьціўся ў Столпу (Нямеччына). У дырыжабля папсаваны хвост.

Справачны аддзел.

Катыроўка пазык.

(НА 20 КРАСАВІКА).

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—62,5, куп. 4—60,5.
Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 4—97,5, куп. 4—95,5.
Абл. 2 сял. паз.—куп. 5.
Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—03,5, куп. 5—01,5.
Абл. 10-проц. паз. 27 г. прад. 25—23, куп. 25—13.
Абл. дзярж. паз. 26 г.—прад. 120, куп. 118.
Абл. 12 проц. дзярж. паз.—прад. 104—66, куп. 104—63.
Абл. 6 проц. паз. індустр.—прад. 24—41,5, куп. 24—31,5.

Што слухаць па радыё.

Субота, 21 красавіка.

6—00	6—30	«Беларускі Піянэр» па радыё (з яўрэйскім аддзелам).
6—30	7—10	Беларуская радыё-газэта [з яўрэйскім аддзелам].
7—10	7—40	Навукова-папулярная гутарка на тэму: „Псыхатэхніка і выбар прафэсіі".
7—40	8—10	Даклад ЦЗС на тэму: «Што зрабіў с.-г. цэнтральны склад да пасяўной кампаніі".
8—10	10—00	Канцэрт.

АПАВЯШЧЭНЬНІ.

Менскае Акруговае т-ва Краязнаўства.

На 22-га красавіка ў 11 гадзін раніцы ў залі клюбу Акрвыканкому (Пляц Волі, д. № 4, 2-гі пад'езд, 3-ці паверх) склікаецца

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КРАЯЗНАЎЧАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ.

ПАРАДАК ДНЮ:
1) Краязнаўчае вывучэньне Менску.
2) Краязнаўства ў менскіх школах.
3) Бягучыя арганіз. справы.

На канфэрэнцыю запрашаюцца ЎСЕ СЯБРЫ ТАВАРЫСТВА, НАСТАЎНІКІ, СТУДЭНТЫ і ўсе, хто цікавіцца краязнаўчай справай. Пасьля канфэрэнцыі эскурсія на краязнаўчую выстаўку.

— У суботу, 21 красавіка, а 7-й гадз. вечара ў малой залі і юбу К. Маркса адбудзецца нарада апоргаў ячэек КПБ г. Менску і дакладчыкаў, якія выступалі з дакладамі па антырэлігійным пытаньні па пуцёўках Акружкому, Райкому і ячэек.

АПА МЕНАКРУЖКОМУ КПБ.

— У пятніцу, 20 красавіка, а 6 гадз. увечары ў памяшканьні Мен. Акружкому КП(б)Б адбудзецца нарада т. т., выжджаўшых у вёску.

Выклікаюцца т. т.: Гэршон, Залін, Хлеўнікаў, Казак, Тамашэўскі, Козель, Бягун, Нахільніцкі, Пяско, Рэмізаў, Здановіч, Карначоў, Вашкевіч, Шнітка, Нароікаў, Каровікаў, Ганцарык, Аўчынікаў, Прафэрансаў, Радкевіч.

Яўна абавязкова.

МЕНАКРУГКОМ.

—Групком Працасьветы № 3 паведамляе, што не адбыўшыся агульны сход членаў саюзу 7-4, адбудзецца ў суботу 21-4, а 8-й гадзіне увечары, у памяшканьні 3-й школы (Міхайлаўская вул., д. № 4, на 4-м паверсе). Просьба зьявіцца абавязкова і без спазьненьня.

Паштовая скрынка.

Бедняку. Ваша заметка „Тепляя семейка или гнездо засевших торговцев" накіравана ў НК РСІ.

Настаўніку М. Ц.—Выбарная праца ва ўсіх установах і служба ў Чырвонай армії залічваецца ў стаж на пенсію за 25 гадовую працу.

Служба ў старой армії і вучэньне не залічваецца.

К—в. Ваша заметка «Справа карысная» накіравана ў Полацкі АВК.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ТЭАТР-КІНО.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». З панядзелка, 16 красавіка, „ДОН ДЫЕГО І ПЭЛАГЕЯ". ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: ГАСТРОЛІ ВЯДОМАГА ВЫКАНАЎЦЫ „ЧУДЕС" ІНДЫЙСКІХ ФАКІРАЎ ІАМА.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". З аўторка, 17-га красавіка, „ЕЕ КАПРИЗ". У 8 частках.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». З аўторка, 17 красавіка, „ПОД ОБСТРЕЛОМ ЭСКАДРЫ"

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З панядзелка, 16 красавіка, 2 фільмы за адзін сэанс „КАРАБЕЛЬ НА МЯЛІ", драма ў 6 част. Рычард Талмэдж у кам. „ПРАЗ ПОЛЫМЯ"—у 6 частк.

Народны Камісарыят Асьветы АБВЯШЧАЕ ДРУГІЯ ТАРГІ аб прадажы на знос:

1. Драўнянага аднапавярховага дому, які знаходзіцца на Земляробскім завулку № 12, крытага бляхай, ацэненага ў 1104 руб.;
2. Хлява з дошчак, крытага гонтамі, які знаходзіцца пры паказаным вышэй доме, ацэненага ў 26 руб.;
3. Драўнянага аднапавярховага дому з мэзанінам і брандмаўэрам, крытага бляхай, які знаходзіцца па Ленінградзкай вул.—№ 14, ацэненага ў 1382 руб.

Таргі адбудуцца 21 красавіка 1928 г. а 3 гадз. дню ў памяшканьні Народнага Камісарыяту Асьветы, пакой № 15, дзе можна штодня знаёміцца з умовамі адносна прадажы.

Жадаючыя таргавацца павінны ўнесьці задатак не пазьней пачатку таргоў.

ПРАДАЕЦЦА ЗРЫЎ-ПАПЕРА І СТАРЫЯ ГАЗЭТЫ. ДАВЕДАЦЦА Ў КАНТОРЫ ГАЗ. «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» (РОГ ВУЛІЦ — КАРЛА МАРКСА І ЛЕНІНСКАЙ).

ЗГУБЛЕНЫ:

— Асабовая карт. Кастрыцкага, выд. Лепельск. РВК. Сяброўская кніжка № 1052 Гурэвіча Р. М., выд. б. Бар. акр. аддз. с.-с. г. с.
— Сяброўская кніжка № 65 Розмана, выд. Лепельск. спажыв. т-вам.
— Вучотна-конская карт. Баранава Г. Ф., выд. Лепельск. РВК.
— Сяброўск. кніжка № 827 Гурэвіча Ч., выд. спажыв. т-вам.
— Сяброўская кніжка № 902 Шкіранда М., выд. Лепельск. спаж. т-вам
— Сяброўск. кніжка № 8 Барысава Ф., выд. Лепельск. спажыв. т-вам.
— Сяброўск. кніжка № 6-14685 Глазмана М. Н., выд. Рабачком. саюза будаўнікоў.
— Патэнт 3 разр. № 160 Рубіна Х. С., выд. Лепельск. грашов. часьцю.
— Сяброўск. кніжка № 6-15144 Маскаленка, выд. Барысаўск. саюз. будаўнікоў.
— Сяброўск. кніжка № 22 Сманцэра В. А., выд. Лепельск. спаж. т-вам.
— Вучотна-асабовая карт. Карбановіча выд. Лепельск. РВК.
— Вучотна-конская карт. Вергейчыка А., выд. Чэрвенскай вучотнай вайсковай каміс. кв. 486.
— Асабовая кніжка запаснога чырвонаарм. Гамезо Н., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом у 1927 г., кв. 487.
— Вучотна-конская карт. № 543 Шахона Л. М., выд. б. Шацкім РВК, кв. 488.
— Вучотна-конская кніжка № 2138 Бараноўскага М. М., выд. Каралінскім РВК Мазырскай акр., кв. 489.
— Пасьведчаньне на налож. плацяжу Зах. чыгункі за № 17894 ад 22-II 28 г. на 180 р. 80 к. па адпраўл. на ст. Бярэзіна па дублікату № 114164 электраматар'ялаў, кв. 490.
— Вучотна-конская картка Галко С., выд. Чэрвенскім вучотн. вайсковым сталом, кв. 491.
— Вучотна-конская кніжка за №№ 512 і 2473 Фяськова Н., выд. Каралінскім РВК, кв. 492.
— Асыгноўка на 5 р. за № 445 ад 11-IУ 28 г. Тышкевіча В. А., выд. Менакрана, кв. 493
— Сяброўскі білет № 137262 Фрэнкель С. А., выд. саюзам Рабіс, кв. 494.
— Вучнёўскі білет і білет аб стыпэндзіі, выд. мустэхнікумам на імя Фрэнкель С. А. кв. 495.
— Вучотна-конская картка Кішко М., выд. Чэрвенскім вайсковым сталом у 1922 годзе, кв. № 496.
— Паявая кніжка за № 1225, выд. Чэрвенскім ЦРК, асабовая вучотна-вайсковая кніжка, выд. Чэрвенскім вайсковым сталом у 1927 г. Быкоўскага П., кв 497.
— Украдзены партбілет № 0814807, выд. акругкомам партыі і пасьведчаньне асобы, выд. Наркамасьветы на імя Мар'ясінай С. А., лічыць страціўшымі моц. Кв. № 499 і № 5 0.
— Вучотна-конская карт. Ажара А. выд. Чэрвенск. вучотнай вайсков. каміс. кв. 485.
— Пасьведчаньне аб сканчэньні фэльчарск. курсаў за № 1108 Раманенка Ф., выд. Тыфліск. санкіраўн.
— Сяброўская кніжка Азарэнка А., выд. Лепельск. спаж. т-вам.
— Сяброўская кніжка № 218 Тухто В., выд. Лепельск. спажыв. т-вам.
— Сяброўская кніжка № 940 Крыцкага І. П., выд. Лепельск. спажыв. т-вам,
— Пасьведчаньне аб аслабаненьні ад вайсков. павіннасьці Аўсіевіча Г. А., выд. Лепельск. Паветраенкаматам.

Галоўлітбел 302.

БАЛЯНС ПОЛАЦКАГА ВОБЧАСТВА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА КРЭДЫТУ.

АКТЫУ

Назва рахункаў.	Уступіцельны баланс на 1-УП 1927 г.	Зварот за 1926-27 год. Дэбет.	Зварот за 1926-27 год. Крэдыт.	Заключны. баланс на 1-X 1927 г.
I. Каса і бяг. рахункі	17884—61	1006831—59	958095—97	66620—23
II. Каштоўнасьці	3535—19	521	260	3796—19
III. Дысконт і спэц. б. р. п-вэксалі	148848—75	315645—19	266707—66	197786—28
IУ. Тавара-пазычковыя апэрацыі	11500	44150—09	41650—09	14000
У. Матэрыя пазыкі	1155445—54	189001—39	102278—95	1242167—98
УI. Карэспандэнты	—	305239—90	304619—52	620—38
УII. Разьліковыя рахункі	—	11375—21	11375—21	—
УIII. Розныя дэбіторы	1285—16	6395—96	5736—22	1944—90
IX. Маемасьць і ўдзел у прадпрыем.	2274—70	280—42	21—70	2533—42
X. Пратэставаныя вэксалі і вяпэўныя даўгі	—	1046—95	1046—95	—
XI. Выдаткі будучых гадоў.	4925—29	2307—56	—	7232—85
БАЛЯНС:	1345699—24	1882795—26	1691792—27	1536702—23

Назва рахункаў.	Уступіцельны баланс на 1-УП 1927 г.	Зварот за 1926-27 год. Дэбет.	Зварот за 1926-27 год. Крэдыт.	Заключны. баланс на 1-X 1927 г.
I. Асноўны капітал	75000	440—90	93275—20	167834—30
II. Інш. уласн. кап. і фонды	534—94	—	—	534—94
III. Займы	1177205—95	109808—02	162412—26	1229710—19
IУ. Перавучот і перазакл.	655—43	217717—14	226775—33	9718—62
У. Уклады і бяг. рахункі	61396—95	501297—28	512603—60	72703—27
УI. Карэспандэнты	—	218887—62	244014—83	25127—21
УII. Разьлік. рахункі і інш. няўстрэбав. сумы	—	97532—46	97582—46	50
УIII. Розныя крэдыторы	9288—61	70336—96	65583—66	4538—31
IX. Прыбыткі будучых год.	6007	—	5119—79	11126—79
X. Неразьмеркаваны прыбытак бягучага году	15610—36	11740—67	11396—91	15266—60
БАЛЯНС:	1345699—24	1227761—05	1418764—04	1536702—23
		3110556—31	3110556—31	

Старшыня Праўленьня АБАБУРКА.

Галоўны Бухгальтар ОСІН.

Сябры Праўленьня:) КОРЗУН.) ВЕЛЮГА.

Старшыня Рэвізійнай Камісіі КАМЕНШТЭЙН.

РАХУНАК ПРЫБЫТКАЎ І ВЫДАТКАЎ ЗА 1926-27 АПЭРАЦЫЙНЫ ГОД

ДЭБЕТ

НАЗВА РАХУНКАЎ	Сума
1. Бягучыя выдаткі	14996—92
2. Процанты сплачаныя	43817—85
3. Камісія сплачаная і іншыя выдаткі	47—84
4. Амортызацыя маемасьці	328—28
5